№ 45 (691) 1 снежня 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я   Б Е Л А Р У С К А Я   Г А З Е Т А

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



## Лукашэнка: версія 4.0

Старонка 2



## Што расійскія нацыяналісты рабілі ў Мінску 5 лістапада?

Старонка 5

## Героі Беларусі: Слуцкае паўстанне

Старонка 12



### Тэндэнцыі

## Wikileaks

У інтэрнэце з'явяцца 1014 сакрэтных дэпешаў амерыканскага пасольства ў Мінску. Усяго ў сеціва трапіць чвэрць мільёна дакументаў Дзярждыэпа. Гэтая найбольшая ў гісторыі ўцечка сакрэтнай інфармацыі. Выцек дакументаў стаў нечаканым вынікам 11 верасня. **Старонка 2.**

## У НУМАРЫ

**«Саша, сыходзь»**
Акцыя апазіцыі пад такім лозунгам сабрала тысячу чалавек. **Старонка 3.**

**Пракаповіч пратрымае даляр**
У новы год даляр будзе каштаваць каля 3000 рублёў. **Старонка 4.**

**У кабінеце Караткевіча вісеў партрэт Каліноўскага**
26 лістапада Уладзіміру Караткевічу споўнілася б 80 гадоў. **Старонка 11.**

**Карэспандэнт «НН» сеў п'яны за руль. Эксперымент**
ДАІ пачало выкарыстоўваць «п'яныя акуляры». **Старонка 15.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Хто перамог у тэлевыступах?

Вынікі першага тура. **Старонкі 8–9.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Кіраўнік штаба Някляева: Магчыма, апазіцыя зможа самастойна правесці экзіт-пол

Прэзідэнцкія выбары пройдуць без незалежных экзіт-полаў. Кіраўнік незалежнай сацыялагічнай лабараторыі «Новак» Андрэй Вардамацкі кажа: «Такой магчымасці цяпер папросту няма».

Правесці экзіт-полы ў Беларусі маглі б замежныя сацыялагічныя службы. У 2006-м такую спробу рабіў аўтарытэтны расійскі «Левада-Цэнтр». Праўда, тады апытанне ўпёрлася ў паўсюдны страх. Людзі масава адмаўляліся адказаць.

Сёлета, як паведаміў нам адказны дырэктар «Левада-Цэнтра» Аляксей Гражданкін, такіх прапановаў ім не паступала: «А калі і будуць, мы адмовімся. Арганізацыя экзіт-полаў у вашай краіне патрабуе некалькіх месяцаў. Часу ўжо не засталося».

Каардынатар кампаніі «За справядлівыя выбары» Сяргей Калякін кажа, што ў межах кампаніі правядзенне экзіт-полаў не плануецца: «У нас такіх мэтаў няма. Мэта нашай кампаніі — арганізаваць назіранне».

**Працяг на старонцы 3.**

# Калумб быў беларусам?



**Меркаваны партрэт Калумба з карціны «Маці Божая Мараплаўцаў» у палацы Альказар у Севільі. Алеха Фернандэс, між 1505 і 1536.**

Амерыканскі гісторык лічыць, што мараплавец паходзіў з Гедымінавічаў.

Нашага палку прыбыла. Амерыканскі гісторык Мануэл да Сілва Роза даводзіць, што Хрыстафор Калумб меў карані ў Вялікім Княстве Літоўскім. Прычым з добрай сям'і. Ягоным дзедам быў вялікі князь Ягайла, а бацькам — той самы Уладзіслаў III, які, лічылася, загінуў у бітве пад Варнай.

Традыцыйна пішуць, што адкрывальнік Амерыкі быў генуэзцам. Але гісторык партугальскага паходжання ў сваёй кнізе «Загадка Калумба раскрытая» (Colon. La Historia Nunca Contada) даводзіць іншае. Аналізуючы старадаўнія хронікі, ён прыйшоў да высновы, што Уладзіслаў Ягайлавіч пасля разгрому туркамі ў 1444 г. збег ад далейшага выканання каралеўскіх абавязкаў на партугальскі востраў Мадэйра. Там ён ажаніўся і стаў бацькам Хрыстафора.

Дзе доказы? А чаму ж за Калумба, чалавека нібыта простага, аддалі замуж партугальскую арыстакратку і іх шлюб зацвердзіў сам кароль? Да таго ж, лічыць гісторык, герб Калумба падобны на герб Уладзіслава. Праўда, няма на тым гербе «Пагоні» і белага арла. Але ёсць рыбы.

Яшчэ доказ — выгляд. Калумб, паводле сучаснікаў, быў блакітнавокі і светласкуры — тыповы ўсходнееўрапеец.

Дарэчы, прозвішча Калумб у перакладзе з партугальскай азначае «Голуб».

На думку гісторыка, Калумб хаваў сваё паходжанне, каб не рассакрэціць бацьку. Сваю таямніцу Хрыстафор Уладзіслававіч знёс у магілу. Магіла — адзінае месца для праверкі гэтай фантасмагарычнай тэорыі: Мануэл Роза шукае магчымасці параўнаць ДНК сыноў Калумба з ДНК Ягайлы. Адпаведныя запыты ўжо зробленыя ў музеі Кракава і Севільі.

Гісторыкі ставяцца да гіпотэзы Розы па-рознаму. У кожным разе, заходнія даследчыкі, як калісь Калумб Амерыку, адкрываюць для сябе Усходнюю Еўропу. Нагадваючы нам, што гісторыя лучыць Беларусь з Захадам, часткай якога яна была доўгія стагоддзі.

**Сяргей Мікулевіч**

# Лукашэнка: версія 4.0

Узбагачэнне, свабода, але без дэмакратыі і мовы. Піша **Андрэй Дынько.**

## У Мінску «Масакра»

У кінатэатрах Мінска з аншлагам ідзе «Масакра». Ні пры саветах, ні 10 год таму такога было не ўявіць — беларускі фільм жахаў! Мала таго — яго дзеянне адбываецца пасля паўстання Каліноўскага.

Папярэдні фільм рэжысёра «Масакры», Андрэя Кудзіненкі, быў забаронены ў Беларусі.

Гэтым разам Кудзіненку запрасіла лукашэнкаўская кінастудыя, і ён атрымаў 2 мільёны даляраў на здымкі...

Беларусь моцна змянілася за 15 гадоў. Нягледзячы на дыктатуру, а некаторыя кажуць: дзякуючы ёй.

Эканоміка расце па кітайскай ці, хутчэй, сінгапурскай мадэлі: рынак без дэмакратыі, пры нізкіх заробках і з моцнай роляй дзяржаўных рэгулятараў. Лукашэнка пэўны, што яна найбольш адпавядае менталітэту беларусаў.

Не ўсе з ім згодныя. За часы дыктатуры сфармавалася паралельнае грамадства. Рок-музыка, самвыдат, дыскусійныя клубы — усё гэта квітнее.

Зоны свабоды ўнутры самога рэжыму растуць.

Каб злавіць хвалю, Лукашэнка гатовы перахапіць у апазіцыі нядаўна крамольны лозунг «За свабоду». «У краіне будзе ўкаранёны прынцып: дазволена ўсё, што прама не забаронена», — піша ён у кароткай версіі сваёй праграмы. 27 лістапада яе апублікавалі ўсе дзяржаўныя газеты.

## «Стаць багацейшымі»

Ідучы на чацвёрты тэрмін, Лукашэнка абяцае эканоміку first і набліжэнне да еўрастандартаў. Гуд бай, СССР! Больш ніякіх мараў пра «аднаўленне вялікай дзяржавы». Праграма Лукашэнкі ставіць задачы папулісцкія, але рэалістычныя. «Беларусь павінна ўвайсці ў лік першых 50 краін свету з найвышэйшым індэксам развіцця чалавечага патэнцыялу», — піша Лукашэнка.

«Умацаваць нацыю» і «Стаць багацейшымі» — два першыя пункты ў раздзеле «Нашы галоўныя мэты». Праўда, пад умацаваннем нацыі маецца на ўвазе ўсяго толькі спрыянне дэмаграфічнаму росту: «Дзяцей павінна быць больш. Кожная сям'я, дзе ёсць чацвёра і больш дзяцей, за кошт дзяржавы атрымае кватэру».

Што тычыцца ўзбагачэння, то тут усё пасапраўднаму.

«Атрымае развіццё прыватная ўласнасць», — запэўнівае Лукашэнка. Той самы Лукашэнка, які 10 гадоў таму называў прадпрымальнікаў «вашывымі блохамі», а лад у краіне — «рынкавым сацыялізмам».

«Па спрашчэнні вядзення бізнэсу Беларусь увайшла ў чацвёрку лепшых рэфарматараў у свеце», — з гордасцю заяўляе Лукашэнка цяпер.

Лукашэнка замахваецца нават на судовую рэформу: «Будзе сфармаваны суд прысяжных і завершана работа па гуманізацыі заканадаўства».

У цэлым, праграма ў аўтарытарнага кіраўніка такая ж папулісцкая, як і ў ягоных галоўных апанентаў. Папулізм стае характэрнай рысай палітычнай культуры беларусаў. У гэтым сэнсе краіна моцна розніцца ад еўрасаюзаўскіх і прыпадабняецца хутчэй да неразвітых краін Азіі і Лацінскай Амерыкі.

Пункты «чэргі адыдуць у мінулае» і «будаваць 10 млн квадратных метраў жылля» нагадваюць пра «да 2000 года кожнай савецкай сям'і — асобную кватэру». Аднак у праграме ёсць і рэалістычныя, ясна пастаўленыя задачы: напрыклад, стварэнне электроннага ўрада. Аналагічна дзейнічалі параўнальныя з нашай краіны, як Эстонія ці Славаччына. Яны, дарэчы, у выніку дэмакратычных і рынкавых рэформаў сапраўды выйшлі і ў топ-50 краінаў свету.

## НЭП па-лукашэнкаўску

Лукашэнка 1.0 верыў, што заваюе расійскі трон. Лукашэнка 2.0 думаў, як сарваць каляровую рэвалюцыю. Лукашэнка 3.0 хацеў трапіць у топ-30 свету па business friendly.

Ён робіць гэта з энергіяй, з якой раней садзіў у турму першае пакаленне беларускіх бізнэсоўцаў.

Ніякіх турмаў больш: перад выбарамі чакаецца гучны акт падпісання Дэкрэта пра эканамічную лібералізацыю, паводле якога за эканамічныя злачынствы будзе забаронена арыштоўваць да прысуду.

Лукашэнка, прыроджаны папуліст, не можа не ісці за грамадскай думкай. Калі ў 1995-м 70% насельніцтва хацела б аднаўлення СССР, цяпер ледзьве 10%.

Прычына? Ніколі беларусы не жылі так добра, як у незалежнай Беларусі. Далі эфект рынкавыя рэформы 90-х.

«Мы пабудавалі сваю дзяржаву» — вось першы пункт у раздзеле праграмы «Што зроблена». «Працягнем будаўніцтва незалежнай, самабытнай Беларусі. Мы не выбіраем паміж Усходам і Захадам і не маем намеру быць чыім-небудзь прыдаткам», — піша ён у раздзеле «Што мы зробім».

Лукашэнка больш не бацька-Сталін. Ён бацька асобнай нацыі. У абмен на эканамічную свабоду Лукашэнка патрабуе толькі аднаго: не чапайце маёй улады.

Працяг на старонцы 7.

## Сціснула

**• ЕС патрабуе забраць балтыйскія газаправоды ў «Газпрома».** Еўракамісія настойвае на тым, каб літоўскі ўрад забраў у расійскага газавага канцэрна кантроль над магістральнымі трубаправодамі краіны. Пра гэта гаворыцца ў лісце, які Брусэль даслаў віцэ-міністру энергетыкі Ромасу Шведасу. Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін раней назваў гэтыя планы Вільні «разбоем».

**• У Беларусь прыйшлі 20-градусныя маразы.** 1 снежня ў краіне чакаецца ўзмацненне маразоў: ноччу мінус 17–22°С, днём мінус 14–21°С. 2 снежня чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Ноччу снег, галалёдзіца, мяцеліца. Тэмпература паветра мінус 18–23°С, днём мінус 11–18°С; па паўднёвым захадзе ноччу мінус 12–17°С.

**• Кіеўскае «Дынама» адмовілася ад перадматчавай трэніроўкі ў Мінску.** Украінская каманда прылятае ў Беларусь 1 снежня. Перадматчавую трэніроўку ў Мінску кіеўцы праводзіць не будуць (яна будзе арганізаваная на базе ў Конча-Заспе напярэдадні вылету). Матч БАТЭ — «Дынама» пройдзе ў Мінску 2 снежня. На гэты дзень прагназуюць моцны мароз.

**• Падзенне еўра ў Беларусі.** Па выніках біржавых таргоў курс еўра знізіўся на 59 рублёў і 1 снежня каштуе 3969 рублёў. Курс даляра застаецца ранейшым — 3032 рублі. Максімальны курс еўра ў Беларусі — на фоне агульнага росту ў свеце — быў зафіксаваны 6–8 лістапада — 4292 рублі. Найніжэйшае значэнне еўра ў гэтым годзе было 8 чэрвеня — 3599 рублёў.

**• Птушак транспартавалі варварскім спосабам.** Незвычайны тавар выявілі гомельскія памежнікі ў машыне жыхара Баранавіч на беларуска-ўкраінскай мяжы. Ён спрабаваў незаконна завезці з Украіны 18 жывых галубоў. Птушак спачатку ўсыпілі, затым кожнага голуба загарнулі ў газету, закруцілі скотчам і схавалі за вадзіцельскае сядзенне. Кіроўца не знайшоў лепшага, як сцвярджаць, што птушкі пасяліліся і звілі гняздо ў іншамарцы падчас яго адсутнасці. Галубы ацэненыя больш чым на мільён рублёў.

**СМ**

# Wikileaks: Расія ўказвае Беларусі, што купляць

У інтэрнэце з'явяцца 1014 сакрэтных дэпешаў амерыканскага пасольства ў Мінску.

Сайт Wikileaks выкладае ў сеціва чвэрць мільёна сакрэтных дэпешаў з амерыканскіх амбасадаў за мяжой. Гэтая найбольшая ў гісторыі ўцечка сакрэтнай інфармацыі.

Гэтыя дэпешы будуць з зацікаўленасцю чытаць як звычайныя грамадзяне, так і кіраўнікі краін. Не ўсе яны мелі магчымасць пабачыць сябе ў люстэрку ацэнак амерыканскай дыпламатыі.

З дакументаў, напрыклад, вынікае, што сусветныя лідары не вераць у самастойнасць прэзідэнта Дзмітрыя Мядзведзева, лічачы яго «Робінам пры Бэтмэну» — у ролі апошняга выступае Уладзімір Пуцін.

З тае чвэрці мільёна дакументаў больш за тысячу будуць тычыцца Беларусі. З'явяцца яны на сайце цягам двух месяцаў. Напачатку Wikileaks выклаў матэрыялы па самых гарачых рэгіёнах планеты.

## Расія дыктуе Беларусі, якія самалёты купляць

У панядзелак з'явіўся першы дакумент, які датычыць Беларусі. Гэта справаздача супрацоўніка пасольства ЗША ў Маскве, у якой апісваецца сітуацыя з пастаўкамі самалётаў «Боінг» у Беларусь і Казахстан. «Урад РФ, як паведамлялася, у бягучым годзе (2010) запатрабаваў, каб Беларусь і Казахстан, набываючы або беручы ў лізінг замежную авіятэхніку, ужывалі расійскі тарыф. Як вынік авіякампаніі краін МС (Мытнага Саюза) павінны будуць выплачваць пошліну за ўсю новую авіятэхніку, якая не трапляе пад выключэнні. Апроч гэтага ўрад РФ запатрабаваў, каб ніякія новыя выключэнні не ўжываліся пасля 20 ліпеня 2010, калі ўзгоднены збор тарыфаў унутры МС павінен уступіць у сілу. У выпадку ўвядзення новая пошліна на імпарт замежнай авіятэхнікі пацягне сур'ёзныя наступствы для паставак «Боінгам» сваіх самалётаў у Беларусь і Казахстан», — паведамляў у Вашынгтон амерыканскі дыпламат.

Такія ўмовы, фактычна, закрываюць карпарацыі «Боінг» дзверы на рынак Беларусі.

## Дакументы ўскрываюць тонкую дыпламатычную кухню.

Аказваецца, Саудаўская Аравія і іншыя краіны Персідскага заліва даўно настойваюць на авіяўдары па Іране. Яшчэ ў красавіку 2008-га кароль Абдала патрабаваў «адсекчы галаву змяі» — спыніць развіццё ядзернай праграмы Ісламскай Рэспублікі. Ізраіль таксама падштурхоўваў Вашынгтон да жорсткай лініі ў дачыненні Тэгерана, заўважаючы, што дыялог з Іранам — «гэта добрая ідэя, але яна не спрацуе».

Усе гэтыя факцікі быццам бы і прадказальныя, але ўскрываюць тое, пра што можна было толькі здагадвацца.

## Мянушкі сусветных лідараў

Амерыканскія дыпламаты даюць асобам і здарэнням трапныя характарыстыкі, з выбарам словаў не цырымоняцца.

Прэзідэнта Афганістана Хаміда Карзая лічаць «слабым лідарам» і «параноікам», французскага прэзідэнта Ніколя Сарказі — «голым каралём» з дыктатарскімі замашкамі. На адрас нямецкага канцлера Ангелы Меркель прагучала заўвага, што яна «баіцца рызыкі і не крэатыўная».

Жан-Давід Левіт, замежнапалітычны дарадца прэзідэнта Францыі, аказваецца, называў у 2009 годзе Іран «фашысцкай дзяржавай», а венесуэльскага прэзідэнта Уга Чавеса — «пальнутым». «На жаль, Чавес прыбраў да рук самую багатую дзяржаву Лацінскай Амерыкі і ператварыў яе ў другую Зімбабвэ», — цытаваў француза амбасадар ЗША ў Францыі Чарлз Рыўкін.


Брэдлі Мэнінг.

Італьянскі прэм'ер Сільвіа Берлусконі ад паверанага ў справах у Рыме Элізабэт Дыбл заслужыў званне «няўдачлівага пыхліўца, неэфектыўнага ў якасці сучаснага еўрапейскага лідара», да таго ж ён робіцца «ўсё ў большай ступені рупарам Пуціна» ў Еўропе.

Працяг на старонцы 13.

## nn@nn.by

Пасля палымяных выступаў Пазняка заўсёды хочацца бегчы ў атаку з вінтоўкай, а пасля выступу Рымашэўскага хочацца бегчы ў атаку са сцягам.

**Віталь з Мінска**

## Самае чытанае на nn.by за 24 — 30 лістапада

- 1000 чалавек на рэпетыцыі Плошчы
- Мегашоу ад Някляева
- Саннікаў — кіраўніку БРСМ: Сядзь на месца!
- Эратычная фотасесія Лукашэнкі
- Саннікаў: «Да вызвалення краіны засталася пара тыдняў»
- Аўтара скандальнага відэароліка пра бабулін пашпарт звольнілі з БТ
- Яраслаў Раманчук: У нас краіна салаўёў–разбойнікаў
- Праграма Лукашэнкі: за ўзбагачэнне і за свабоду
- Кастусёў: Хто не краў, той не сядзе
- Жахі стабільнасці. Новыя жорсткія ролікі з крытыкай лукашызму

# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 4 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

**Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.**

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты:**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

**Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»:** для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам, якія падпісваюцца праз Рэдакцыю

Аляксандру Л., В.С., Аляксандру М., Віктару В., Таццяне Ф., Людміле К., Уладзіміру І., Я.Ш., Рэгіне К., Генадзю Б., Але П., А.М., В.Ч., Адаму Ш., І.М., І.Б. з Мінска.

Дзякуй спадару **Міколу Яўмененку** з Чудзенічаў (Лагойскі раён) за смачную садавіну, якую ён цэлае лета прывозіў нашаніўцам.

# «Саша, сыходзь»

Акцыя апазіцыі пад такім лозунгам сабрала тысячу чалавек.



PHOTO.BYMEDIA.NET

24 лістапада ў Мінску прайшла рэпетыцыя Плошчы. Арганізатарамі мітынгу выступалі адразу некалькі арганізацый, аднак асноўную ролю адыгралі «Малады фронт» і Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Акцыя была дастаткова шматлюдная.

У мітынгу на прыступках Палаца прафсаюзаў узялі ўдзел тры кандыдаты ў прэзідэнты: Віталь Рымашэўскі, Мікола Статкевіч і Уладзімір Някляеў. Калі першыя два выступалі з палітычнымі заявамі і прынялі рэзалюцыю аб свабодных выбарах, то Някляеў абмежаваўся «сустрэчай з выбаршчыкамі» і прачытаў верш.

Мітынгам на Кастрычніцкай плошчы акцыя не скончылася. Рымашэўскі і Статкевіч вырашылі аднесці прынятую рэзалюцыю ў ЦВК і павялі за сабой натоўп. Ідэя была сустрэтая з захапленнем — наперадзе шэсця моладзь несла вялікую расцяжку са словамі «Саша, сыходзь».

Па дарозе сустрэлі Алеся Міхалевіча, але ён ад удзелу ў мерапрыемстве адхрысціўся. Саннікава і Кастусёва не было, бо ў той час яны запісвалі свае тэлевыступы на БТ.

«Ці баюся я санкцый? Галоўнае, каб супраць мяне не ўжылі такіх жа санкцый, як супраць Ганчара, Захаранкі, Завадскага», — адзначыў Віталь Рымашэўскі.

Ля ЦВК калону, у якой на той час засталося каля чатырохсот удзельнікаў, сустрэлі некалькі дзясяткаў ахоўнікаў. «ЦВК ужо не працуе, прыходзьце ў іншы час», — паведамілі яны Рымашэўскаму і Статкевічу.

Пасля гэтага кандыдаты вырашылі правесці яшчэ адзін невялікі мітынг, на гэты раз перад будынкам урада. Падчас выступленняў выказвалася ўпэўненасць, што Плошча адбудзецца і будзе больш шматлюднай. «Сёння тут некалькі тысяч чалавек, а 19-га будзе некалькі дзясяткаў тысяч», — заявіў лідар «Маладога Фронту» Зміцер Дашкевіч.

Сама акцыя прайшла мірна і без затрыманняў, хоць і выклікала вялікую цікавасць з боку спецслужбаў. На ёй таксама прысутнічала мноства тэле- і радыёжурналістаў з Расіі. Яны, дарэчы, ацанілі колькасць удзельнікаў аж у пяць тысяч чалавек.

25 лістапада Генпракуратура вынесла В.Рымашэўскаму і М.Статкевічу папярэджанні. Уладзімір Някляеў за ўдзел у рэпетыцыі Плошчы пакараны не быў.

**Алесь Пілецкі**

## Лукашэнка звінаваціў Някляева і Саннікава ў атрыманні грошай з Расіі

Кіраўнік Беларусі заявіў, што мае факты фінансавання Расіяй апазіцыйных кандыдатаў Уладзіміра Някляева і Андрэя Саннікава. Гэта прагучала ў інтэрв'ю французскай газеце «Фігаро».

На пытанне журналіста, ці дапамагае Расія частцы апазіцыі, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Гэта так, і мы гэта ведаем. У нас ёсць факты. Уладзімір Някляеў, Андрэй Саннікаў — гэта людзі, якія сёння фінансуюцца Расіяй».

Гаворачы аб магчымасці супрацоўніцтва ўлады з апазіцыяй, Лукашэнка не выключыў такой сітуацыі. Аднак гэта было сказана, толькі каб далей рытарычна дыскрэдытаваць сваіх апанентаў. Лукашэнка заявіў: «Наша так званая апазіцыя пакуль дзейнічае з пазіцыі «чым горш — тым лепш»: чым горш для народа — тым лепш для іх. На такіх асновах я не толькі з апазіцыяй, але ў тым ліку і з любымі іншымі грамадзянамі Беларусі або замежнымі дзяржавамі супрацоўнічаць не буду», — падкрэсліў Лукашэнка.

Дарэчы, на наступны дзень Лідзія Ярмошына не выключыла магчымасці зняцця Някляева і Саннікава з выбарчай гонкі, калі будуць наяўныя канкрэтныя доказы іх фінансавання з боку суседняй дзяржавы.

**Мікола Бугай**

## Кандыдат Цярэшчанка «за саюз Беларусі і Расіі»

Ён падпісаў адпаведны маніфест.

Маніфест быў апублікаваны ў інтэрнэце на мінулым тыдні.

«Чаканні беларусаў і расіян не апраўдаліся. За дзесяць гадоў з моманту падпісання дамовы аб саюзнай дзяржаве рэальнае ўз'яднанне брацкіх народаў так і не адбылося. Бюракратычныя гульні і чыноўніцкі эгаізм прывялі да таго, што стварэнне саюзнай дзяржавы апынулася пад рэальным зрывам», — пішацца ў звароце.

Мэта гэтага звароту — «пачаць працэс грамадскай падтрымкі эканамічнай і палітычнай інтэграцыі Беларусі і Расіі».

Сярод падпісантаў гэтага звароту — кіраўнік аналітычна-інфармацыйнага цэнтра «Імперыя» Юры Баранчык, гісторык Сяргей Шыптэнка, былы віцебскі чыноўнік Андрэй Герашчанка, казацкі атаман Чудаеў. Самым цікавым у гэтым спісе выглядае кандыдат у прэзідэнты Віктар Цярэшчанка.

Усе гэтыя людзі выступаюць супраць Лукашэнкі, але за больш цеснае супрацоўніцтва з Расіяй.

Дарэчы, выступ Цярэшчанкі на тэлебачанні быў абсалютна папулісцкі. Кандыдат паабяцаў зрабіць курс беларускага рубля да даляра 1 да 1. У выпадку ж перамогі Лукашэнкі Цярэшчанка паабяцаў сваю праграму аддаць кіраўніку дзяржавы.

**Зміцер Панкавец**

## Спявай, а то прайграеш

«J:морс» змушалі спяваць у «Беларусь — гэта мы».

Прэзентацыя новага альбома «J:морс» «Электрычнасць» у Палацы спорту, запланаваная на 11 снежня, адбудзецца. Пра гэта паведаміў Зміцер Бескаравайны, прэс-сакратар гурту. Па яго словах, пра гэта ім паведамілі ў адміністрацыі палаца.

24 лістапада ў сваім блогу лідар «J:морс» Уладзімір Пугач напісаў, што канцэрт можа быць адменены. Прычына — напярэдадні «J:морс» адмовіўся ўдзельнічаць у акцыі «Беларусь — гэта мы». Гурт прынцыпова не ўдзельнічае ў палітызаваных мерапрыемствах, а ў дадзеным выпадку дадавалася неабходнасць выступаць пад фанаграму.

Са слоў Пугача, не дачакаўшыся згоды выступаць, арганізатары канцэрта (тэлеканал АНТ) пачалі пагражаць. «Калі вы адмовіцеся ўдзельнічаць у гэтым канцэрце, мы маем права зрабіць так, што вас прыбяруць з усіх каналаў краіны». А потым ад пагрозаў перайшлі да канкрэтных дзеянняў: канцэрт у Палацы спорту адмянілі «ў сувязі з правядзеннем там 11 снежня спартыўнага мерапрыемства».

Нагадаем, што альбом «Электрычнасць» можна бясплатна спампаваць на сайце гурта.

**Сямён Печанко**

## Аўтара відэароліка пра бабулін пашпарт звольнілі з БТ

Кіраўніцтва папрасіла рэжысёра сысці «па ўласным жаданні».

Ролік «Бабуля-2010» з'явіўся ў інтэрнэце 8 лістапада і выклікаў велізарную цікавасць. За першы дзень яго паглядзелі ў інтэрнэце 23 тысячы гледачоў. Як высветлілася, рабіў яго інжынер відэамантажу Белтэлерадыёкампаніі, студэнт-завочнік Акадэміі мастацтваў Яўген Шапчыц.

Пасля відэа стала недаступнае. Адміністрацыя Youtube змясціла тлумачэнне, што «ролік мае непрымальны змест». Самога ж рэжысёра праз некалькі дзён пасля «прэм'еры» выклікалі да кіраўніцтва і папрасілі звольніцца.



Ролік уяўляе сабой сатыру на збор подпісаў за Аляксандра Лукашэнку. Ён утрымлівае заклік да моладзі дзейнічаць супраць.

**МБ**

## Саннікаў — кіраўніку БРСМ:
# Сядзь на месца!

Падчас сустрэчы з выбарцамі ў Слуцку кандыдат у прэзідэнты Андрэй Саннікаў дасціпна асадзіў мясцовага кіраўніка суполкі БРСМ.

Міхаіла Лабковіча зацікавіла, які лёс будзе чакаць ягоную арганізацыю ў выпадку перамогі Саннікава. Кандыдат на гэта сказаў: «За нашы з вамі грошы створана арганізацыя, што падтрымлівае дыктатара».

Словы Саннікава сарвалі апладысменты. Калі Лабковіч спрабаваў паўторна прарвацца да мікрафона, то яго пачалі штурхаць удзельнікі сустрэчы.

Сам Саннікаў гэтага таксама не вытрымаў, асадзіўшы маладзёна: «Сядзьце на месца».

**ЗП**

## Кіраўнік штаба Някляева: Магчыма, апазіцыя зможа самастойна правесці экзіт-пол

Працяг са старонкі 1.

А вось Аналітычны цэнтр «Экаом», блізкі да Адміністрацыі прэзідэнта, выказаў жаданне рабіць апытанне на выхадах з участкаў. «Мы будзем праводзіць экзіт-полы. Аб гэтым нават Ярмошына афіцыйна заявіла», — паведаміў «НН» яго кіраўнік Сяргей Мусіенка.

«Экаом» быў адной з дзвюх структур (разам з сацыялагічнай службай пралукашэнкаўскага Камітэта міжнародных моладзевых арганізацый), якія ладзілі апытанні ля ўчасткаў у 2006 годзе. Тады лічбы «Экаома» мала розніліся ад вынікаў Ярмошынай. Асаблівы недавер выклікаў той факт, што гэтую лічбу дзяржаўныя СМІ пачалі агучваць ад самага ранку, хоць нармальны экзіт-пол робіцца да вечара.

На думку кіраўніка штаба Уладзіміра Някляева, Андрэя Дзмітрыева, адмова лабараторыі «Новак» звязаная з ціскам з боку ўлады. «Новак» пад пагрозай знішчэння. На іх наклалі штраф у 70 мільёнаў рублёў. Зразумела, што яны перад складаным выбарам», — кажа А.Дзмітрыеў.

Кіраўнік штаба Някляева не выключае, што апазіцыя зможа самастойна правесці экзіт-полы: «Усе ведаюць, што такое «Экаом», як ён працуе. А нам трэба незалежныя лічбы».

**Алесь Пілецкі**

# Падпісваем шмат, выконваем мала

Ніводны з вялікіх праектаў, падпісаных на Лонданскім інвестфоруме–2008, не рэалізаваны.

$2,7 мільярда дамоў на III Беларускім інвестфоруме ў Франкфурце — многа ці мала? Каб ацаніць, давайце параўнаем вынікі трэцяга форуму з двума папярэднімі.

| Год | Месца правядзення | Колькасць праектаў | Сума праектаў | Падпісаныя дамовы | Рэалізаваныя дамовы |
|---|---|---|---|---|---|
| 2008 | Лондан | 75 | $8 млрд | больш за $3 млрд | ? |
| 2009 | Мінск | 100 | $6 млрд | каля $3 млрд | ? |
| 2010 | Франкфурт | 160 | $14 млрд | $2,7 млрд | ? |

### Без кітайцаў — нікуды

Першы Беларускі інвестыцыйны форум адбываўся ў Лондане. Тады было прадстаўлена ўсяго 75 прапаноў. Колькі з іх было рэалізавана, улады не паведамілі, але, па словах пасла Беларусі ў Вялікабрытаніі Аляксандра Міхневіча, падпісаныя дамовы агулам пацягнулі больш за $3 мільярды.

Гучыць унушальна, калі не звяртаць увагу, на якія праекты ўлады ўкладалі асаблівае спадзяванне. Самымі дарагімі тады называліся новая вытворчасць на МТЗ, выпуск аўтамабіляў на МАЗе, лістапракатная вытворчасць на Беларускім металургічным заводзе, вытворчасць бялёнай цэлюлозы. Кожны з тых праектаў цягнуў на мільярд даляраў ці нават больш.

Ніводны з іх не рэалізаваны да гэтага часу, адно што кітайцы зацікавіліся цэлюлозным камбінатам і падпісалі дэкларацыю аб намерах.

### Бельгійскі дэлегат

Згодна з прынцыпам чаргавання «замежжа—Беларусь» наступны форум адбыўся ў Мінску. Колькасць дэлегатаў была такой, што ім не хапіла месцаў у канферэнц-зале Нацыянальнай бібліятэкі. Найбуйнейшым кантрактам стала дэкларацыя аб намерах бельгійскай кампаніі, якая сабралася будаваць лагістычны цэнтр пад Мінскам за мільярд даляраў.

Перавага форуму перад астатнімі была хаця б у эканоміі бюджэтных сродкаў. Дарэчы, у 2011 годзе мерапрыемства мяркуецца таксама правесці на тэрыторыі Беларусі.

### Доўгачаканая адкрытасць лічбаў

На апошні форум дэлегацыі гасцей з'язджаліся ў нямецкі Франкфурт-на-Майне. Сідорскі ўпершыню назваў колькасць заключаных пагадненняў — 22 дамовы на 2,7 мільярда. Нарэшце знайшоў інвестара лістапракатны завод, які вісеў мёртвым грузам на кожным форуме, пачынаючы з Лондана. Увогуле, большасць прапаноў вандруе з года ў год, не выклікаючы ніякай цікавасці з боку замежных бізнэсоўцаў.

Дырэктар Нацыянальнага інвестыцыйнага агенцтва Беларусі Віктар Каваленка перакананы ў тым, што тэндэнцыя, наадварот, станоўчая. На пытанне пра карысць інвестыцыйных форумаў ён адказвае: «За апошні каляндарны год заключана больш за 270 інвестыцыйных пагадненняў, у той час як за ўвесь папярэдні час — усяго 6 дамоў». Але ў гэтую статыстыку ён уключае ўсе пагадненні. Пераважная большасць з іх падпісаныя па-за межамі форумаў. Правядзенне мерапрыемстваў такога кшталту можа прыносіць інвестыцыі, але спадзявацца толькі на іх з кожным годам становіцца ўсё складаней і складаней.

**Яўген Васількоў**




## Пракаповіч пратрымае нізкі курс даляра да канца года

У новы год даляр будзе каштаваць каля 3000 рублёў.

Старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч прагназуе курс даляра ЗША на канец 2010 года «блізкім да трох тысяч беларускіх рублёў».

Банкір мяркуе, што рубель будзе ўмацоўвацца і складзе прыкладна 2995—3010 рублёў за адзін даляр. Пракаповіч перакананы, што ў Беларусі няма неабходнасці для правядзення дэвальвацыі.

Банкір падкрэсліў, што мінулая дэвальвацыя (у студзені 2009 года) была вымушаным крокам. А цяпер, маўляў, сітуацыя зусім іншая.

**ЯВ**

## Беларусь — лідар па інфляцыі ў Еўропе

А ў сусветным маштабе са 160 краін саступае толькі Зімбабвэ, Анголе і М'янме.

Сярод краін, па якіх маецца статыстыка па змене індэкса спажывецкіх цэн, Беларусь па тэмпах росту — абсалютны лідар у Еўропе за апошняе дзесяцігоддзе. А ў сусветным маштабе з 160 краін саступае толькі Зімбабвэ, Анголе і М'янме.

Ва ўсякім разе, гэта вынікае са справаздачы Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (FAO) за 2009 год. У ёй параўноўваюцца дадзеныя за 2007 год. Але гэта не змяняе сутнасці справы: кошт спажывецкага кошыка тавараў і паслуг у Беларусі рос і расце. У 2008 годзе рост склаў 113,3%, у 2009 — 110,1%.

У параўнанні з 2000 годам, які FAO бярэ ў якасці асновы для разліку, у 2007 годзе тэмп росту індэкса спажывецкіх коштаў у Беларусі склаў 445,9%.

**Тэмпы росту цэн з 2000 да 2007 г.**

| | |
|---|---|
| Зімбабвэ | 21 602,0% |
| Ангола | 2347,7% |
| М'янма | 481,3% |
| Беларусь | 445,9% |
| Турцыя | 392,7% |

Гэта чацвёрты паказчык у спісе. Абсалютным лідарам антырэйтынгу з'яўляецца Зімбабвэ, дзе гэты паказчык склаў 21 602% (!).

Для параўнання з суседзямі адзначым, што ў 2007 годзе рост цэн у Расіі дасягнуў 238,8%, ва Украіне — 180,8%, у Латвіі — 143,0%, у Польшчы — 118,6%, у Літве — 114,4%. Крызіс 2008—2009 гадоў, вядома ж, унёс карэкціроўкі ў выпадку з кожнай краінай, але на агульнае становішча спраў наўрад ці сур'ёзна паўплываў.

**Паводле Zautra.by**

## Прыйшлі кітайскія мільярды

Леташняе беларуска–кітайскае пагадненне нарэшце запрацавала.

На рахунак Нацыянальнага банка Беларусі, адкрыты ў Народным банку Кітая, залічаныя першыя грошы ў памеры 6 мільярдаў юаняў, што складае каля $900 млн.

У сакавіку 2009 года краіны заключылі пагадненне аб правядзенні валютнай здзелкі «своп», каб садзейнічаць двухбаковаму гандлю і інвестыцыям. Аб'ём гэтай здзелкі — 20 мільярдаў юаняў.

Гэтыя грошы будзе магчыма выкарыстоўваць толькі для закупу кітайскіх тавараў. Кампаніям не прыйдзецца пераводзіць грошы з валюты ў валюту.

**ЯВ**

### Сцісла

• **Беларусь гатовая судзіцца з Латвіяй.** Цана пытання — каля $100 мільёнаў. Прыблізна столькі каштуе тэхналагічная нафта, якую латвійскі аператар трубаправода «Вэнтспілс—Полацк» LatRosTrans хоча зліць з трубы, каб кампенсаваць свае страты ад прастою. Калі нафта будзе зліта, гэта фактычна паставіць крыж на беларуска-латвійскім нафтавым супрацоўніцтве.

• **Крэдыт на кватэру пад 1% будуць даваць нават у буйных райцэнтрах.** Цяпер атрымаць 1%-ны крэдыт могуць толькі чаргавікі, якія жывуць у гарадах з колькасцю насельніцтва да 40 тысяч чалавек, а таксама у Кобрыне, Слуцку, Рэчыцы і Светлагорску. Больш за тое, тэрмін пагашэння такіх крэдытаў узрасце ад 20 да 40 гадоў.

• **Ірландыі выдадуць 85 млрд еўра на крызіс.** У абмен на фінансавую дапамогу ўрад краіны абяцаў скараціць выдаткі на 10 млрд еўра. План прадугледжвае скарачэнне пенсій і заробкаў, павелічэнне падаткаў і звальненне бюджэтнікаў.

• **Януковіч не хоча ўвайсці ў Мытны саюз.** Прэзідэнт Украіны ўхіліста адзначыў, што для гэтага трэ было б унесці змены у канстытуцыю краіны. У сваю чаргу, прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў заявіў, што хацеў бы бачыць Украіну ў складзе Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

**ЯВ**

## Беларусь не размясціла аблігацыі ў Расіі, каб не вяртаць пазыку?

Тым часам Міністэрства фінансаў сабралася прадаць аблігацыі азіятам.

Расійскія СМІ з непрыхаваным здзіўленнем паведамілі, што беларускія ўлады вырашылі адкласці размяшчэнне аблігацый на расійскім рынку. Як паведамлялася раней, Беларусь мела намер размясціць у Расіі выпуск двухгадовых рублёвых еўрабондаў у аб'ёме да 15 мільярдаў расійскіх рублёў — гэта каля $500 мільёнаў. Арганізатарам выпуску аблігацый мусіў выступіць расійскі «Сбербанк».

Упершыню ў гісторыі расійскага рынку замежная кампанія, якая не з'яўляецца міжнароднай фінансавай арганізацыяй, атрымала дазвол на публічнае размяшчэнне каштоўных папер.

Беларусь хацела размясціць аблігацыі ў два этапы. Першы складаў 7 мільярдаў расійскіх рублёў ($230 мільёнаў). Астатнія аблігацыі меркавалася прадаць да канца года.

Чаму беларускія ўлады перадумалі? Афіцыйнае меркаванне выказаў першы намеснік міністра фінансаў Уладзімір Амарын. «У цэлым сітуацыя на фінансавых рынках у свеце аказалася нестабільнай у гэты перыяд. Але праводзіцца маніторынг сітуацыі. Мы працуем», — заявіў ён.

Але ёсць і іншае тлумачэнне: грошы, атрыманыя ад продажу аблігацый, прыйшлося б адразу аддаць у кошт ранейшага крэдыту. Нагадаем, што 31 снежня 2009 года Беларусь атрымала ад расійскіх банкаў крэдыт памерам $200 мільёнаў. Паводле пагаднення, беларусы мусілі расплаціцца сродкамі, атрыманымі ад размяшчэння еўрабондаў. А калі размяшчэння няма, то і грошай няма.

Тым часам беларускі ўрад ухваліў размяшчэнне дзяржаўных аблігацый не менш чым на $500 мільёнаў у Азіі. Пра гэта расказаў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч. Паводле яго слоў, тэрмін размяшчэння складзе сем гадоў, а ўмовы будуць прыкладна такімі ж, на якіх былі размешчаныя першыя беларускія еўрабонды летам гэтага года. Што да далейшага размяшчэння беларускіх дзяржаблігацый на еўрапейскім рынку, то, паводле слоў Пракаповіча, у найбліжэйшы час фінансісты не бачаць для гэтага падстаў і неабходнасці.

**ЯВ**

# Што расійскія ультранацыяналісты рабілі ў Мінску?

У дзень прыезду сяброў «Русского образа» ў Мінск невядомыя павалілі крыжы ў Курапатах.

5 лістапада ў Мінск прыязджалі прадстаўнікі расійскага ультранацыяналістычнага руху «Русскій образ».

У сталіцы Беларусі яны сустракаліся з сябрамі мясцовай прарасійскай арганізацыі «Русь молодая» (у скароце — «Румол», што сугучна з расійскай «Россией молодой»). Чаго прыязджалі?

Пра гэта ў духу лукашэнкаўскай інтэграцыйнай рыторыкі гаворыцца на сайтах абедзвюх арганізацый: «умацаванне сувязяў паміж сяброўскімі арганізацыямі, супрацоўніцтва ў галіне гуманітарных і культурна-асветніцкіх праектаў, а таксама стварэнне адзінай інфармацыйнай прасторы».

Гаварылі і пра «Рускі марш», які прайшоў нядаўна ў Расіі. Прадстаўнікі «Румола» нагадалі пра забарону аналагічнага «Славянскага марша» ў Магілёве. Гарадскія ўлады адмянілі яго, бо выкарыстоўвалася незарэгістраваная сімволіка — расійскі імперскі чорна-жоўта-белы сцяг.

### «Узбройвайся!»

«Русскій образ» расійскія СМІ называюць нацыяналістычнай арганізацыяй новага тыпу, якая мае на мэце змагацца з «засіллем мігрантаў» палітычнымі метадамі, трапіўшы ў парламент. Але на іх сайце ёсць раздзел «Узбройвайся!», дзе падрабязна тлумачыцца, як рэгістраваць зброю.

«РО» ўваходзіць у кааліцыю з «Рухам супраць нелегальнай іміграцыі» (ДПНІ) — рост колькасці імігрантаў стаў вялікай праблемай у буйных гарадах Расіі.

Як грамадскі рух «Русскій образ» паўстаў з асяродка аўтараў і чытачоў аднайменнага часопіса. Аднаго з заснавальнікаў выдання, Мікіту Ціханава, цяпер вінавацяць у забойстве адваката Станіслава Маркелава і журналісткі Анастасіі Бабуравай. Дарэчы, Ілля Гарачаў, адзін з кіраўнікоў «РО», якога дапытвалі па справе Маркелава ў якасці сведкі, прыязджаў 5 лістапада ў Мінск.

### Крыжы ламалі «нейкія дурачкі»

Цікавае супадзенне: у дзень візіту сяброў «Русского образа» ў Мінск невядомыя павалілі сорак крыжоў у Курапатах. Праз некалькі дзён на сайце «Румола» з'явіўся допіс пад загалоўкам «Курапаты: каму гэта выгадна». Выказваецца здагадка, што за актам вандалізму могуць стаяць беларускія нацыяналісты, якія такім чынам спрабуюць «стравіць рускі і беларускі народы».

Сябра Цэнтральнай рады «Румола» Сяргей Лушч, да якога «НН» звярнулася па каментар, лічыць, што зрабілі гэта не абавязкова прадстаўнікі легальнай палітычнай сілы. «Гэта магла быць і аўтаномная група, якая вырашыла сыграць на сітуацыі». На пытанне, ці не больш лагічна было б уявіць, што крыжы валілі асобы, блізкія па духу да «Румола», сп.Лушч адзначыў, што гэта было б «глупа» і «занадта відавочна»: «У такім разе гэта нейкія дурачкі, іначай я не магу сказаць».

На пытанне пра мэты ўзаемадзеяння з «Рускім Образам» суразмоўца адказаў, што «Румол» працуе не толькі з расійскімі, а і з украінскімі, і нават польскімі славянскімі арганізацыямі. Напрыклад, з таварыствам «Маларосія», зарэгістраваным у Ольштыне.

Рубрыку «Узбройвайся», якая ёсць на сайце «РО», і адпаведную ідэю «Румол» пераймаць не збіраецца. «Не трэба нам гэта», — кажа сп.Лушч.

### У яўрэяў ёсць свае арганізацыі

«Румол» — гэта моладзевы праект Беларускага грамадскага аб'яднання «Русь». Сваімі мэтамі «румолаўцы» бачаць патрыятычнае выхаванне моладзі, заснаванае на «прынцыпах і каштоўнасцях славянскага свету», прапаганду здаровага ладу жыцця. Яны выступаюць супраць культуры спажывання.

Віднае месца ў пантэоне герояў «Румола» займае генералісімус Сувораў. Яго 280-годдзе арганізацыя нават адзначыла нанясеннем надпісу на сцяну мінскага дома.

Сайт «Румола» з'явіўся ўсяго пару месяцаў таму. Хоць побач з лагатыпам стаіць дата: «1074». Што за год? Маскву, здаецца, у 1047-м заснавалі? «Гэта дата духоўная, — адзначае сп. Лушч. — Год здушэння апошняга паўстанння паганцаў на тэрыторыі тады яшчэ адзінай Русі — у Ноўгарадзе. Перамога праваслаўя».

Што праўда, рух пазіцыянуе сябе як пазарэлігійны. Беларусы — унікальны народ, кажа сп.Лушч. Але гэтая ўнікальнасць можа страціцца ў працэсе інтэграцыі ў «англасаксонскую цывілізацыю».

Нават у «румолаўскім» артыкуле пра Курапаты робіцца акцэнт на тым, што ад НКВД пацярпелі там не беларусы, а «ўсе славяне». Бо расстрэльвалі не па нацыянальнай, а па «сацыяльнай» прыкмеце. А як жа рэпрэсаваныя там яўрэі? «У яўрэяў ёсць свае арганізацыі, а мы займаемся славянствам», — кажа сп.Лушч. Хоць і іх трагедыі не адмаўляе. Адзначыў таксама, што яго продкі мелі дачыненне да партызанскага руху на Лагойшчыне «і нават да ліквідацыі Кубэ».

### Нékляеў не такі прарасійскі

Сярод апошніх абнаўленняў сайта — гутарка з кандыдатам у прэзідэнты Віктарам Цярэшчанкам пад загалоўкам «Саюз з Расіяй сёння, заўтра і на вякі». У прыватнасці, кандыдат адзначае, што ў Беларусі «створаныя ўсе ўмовы для развіцця кожнай з дзяржаўных моваў». «Цярэшчанка выказвае пазіцыі найбліжэйшыя да нашых, — кажа сп.Лушч. — З астатніх кандыдатаў хіба Някляеў выказвае прарасійскія погляды, але больш стрымана».

У незалежніцкім моладзевым асяродку з'яўленне «Румола» для многіх прайшло незаўважна.

«Першы раз чую», — прызнаўся старшыня незарэгістраванага «Маладога фронту» Зміцер Дашкевіч.

Найбольш абазнаным выявіўся Юрась Карэтнікаў, актывіст зачыненай уладамі арганізацыі «Правы альянс». Ён перакананы, што госці не датычныя да ламання крыжоў у Курапатах. «Русскій образ» такімі рэчамі не займаецца. Наадварот, яны ствараюць сабе вобраз цывілізаванай сілы. Тыя лідары, што прыязджалі ў Мінск, — адэкватныя людзі», — кажа Карэтнікаў. Што датычыць «Румола», дык ён, лічыць Карэтнікаў, створаны сіламі, блізкімі да пракрамлёўскага інфармацыйна-аналітычнага партала Imperiya.by.

**Сяргей Мікулевіч, Сямён Печанко**



Расійскіх нацыяналістаў прымалі ў офісе мінскай «Русі маладой».




Раней беларусы пабывалі ў Маскве на «Русском марше».

# Паставіў помнік — звальняйся



Міхась Бернат можа страціць працу ў музеі пад Баранавічамі.

Баранавіцкім чыноўнікам не спадабалася, што краязнавец Міхась Бернат разам з сябрамі браў удзел у аднаўленні шыльды ў гонар Палонкаўскай бітвы (№44).

Краязнаўцу на мінулым тыдні патэлефанаваў загадчык аддзела культуры Баранавіцкага райвыканкама Сяргей Седач. Ён запатрабаваў тлумачальную запіску з нагоды адкрыцця шыльды. Сп. Бернат адмовіўся. Тады в.а. дырэктара Русінаўскага музея, дзе працуе краязнаўца, загадалі напісаць дакладную на Берната. Маўляў, ён адкрываў шыльду ў працоўны час. Калі адбудзецца разгляд па гэтай справе, невядома. Але ў райвыканкаме ў тэлефоннай размове яму паведамілі, што працу прыйдзецца пакінуць.

Міхасю Бернату — 65 гадоў. Калі ён страціць пасаду метадыста ў музеі, усё роўна будзе шукаць працу. Бо на адну пенсію не пражыць.

**Сяргей Макарэвіч**

# Студэнт збірае грошы на Ішкальдскі рэгістр



Айцец Ігар Лашук: У рэгістры можа быць запіс пра Дамейку.

Пачаўся збор сродкаў на Рэгістрацыйную кнігу Ішкальдскага касцёла (№44). Мінскі студэнт Андрэй Радкоў вырашыў арганізаваць збор сродкаў, каб выкупіць Рэгістр. Ён хоча перадаць яе касцёлу ў Ішкальдзі, папярэдне адсканаваўшы дакумент для архіваў.

Рэгістрацыйная кніга Ішкальдскай парафіі за 1759—1807 гады выстаўлялася на інтэрнэт-аўкцыён, але няўдала — ахвотных выкласці за ўнікальны дакумент 3 000 000 рублёў не знайшлося.

Да справы падключыўся пробашч каталіцкай парафіі ў мінскай Серабранцы а.Ігар Лашук. Ён мяркуе, што ў рэгістры можа знайсціся запіс пра хрост Ігната Дамейкі. Ён нарадзіўся ў 1802 годзе ў вёсцы Медвядка, што цяпер у Навагрудскім раёне, але належала да Ішкальдскай парафіі.

Пераказаць грошы можна на рахунак: АСБ Беларусбанк №01146129 філіял 514, аддзяленне 300.

Кантактныя тэлефоны: (044) 748-16-57 (Андрэй Радкоў), (029) 648-78-45 (а. Ігар Лашук).

**СП**

# Аўтамабіль пратараніў

сцяну на Акрэсціна



ONLINER.BY

Мінчук на аўтамабілі Citroen Xantia пратараніў сцяну на 2-м Прылуцкім завулку недалёка ад сумнавядомага спецпрыёмніка на Акрэсціна. У цаглянай сцяне ўтварыўся вялізны пралом. Машына атрымала нязначныя пашкоджанні.

Прычына аварыі — у непаладках аўтамабіля, лічаць у ДАІ Маскоўскага раёна. Кіроўца страціў кіраванне, і машыну вынесла да сцяны. Кіроўца быў абсалютна цвярозы.

Аўтамабіль мала пабіўся, бо сцяна вайсковай часткі №5529 слабая, складзеная «ў паўцагліны». Ударыў бамперам — пасыпалася.

Прэтэнзій да кіроўцы ДАІ не мае. Цяпер ва ўсім будзе разбірацца страхавая кампанія.

**Юрась Ускоў**

# «Саўбелія» зрабіла Лукашэнку шатэнам



Рэтушаванае фота было змешчанае ў нумары за 27 лістапада

першая паласа якога цалкам прысвячалася праграме кандыдата ў прэзідэнты РБ Аляксандра Лукашэнкі.

Сівізна кіраўніка Беларусі нечым не спадабалася рэдактарам «СБ», і яны вырашылі ператварыць яе ў маладыя каштанавыя пасмы. Лысіна засталася некранутай.

Цікава, што колер валасоў Лукашэнкі не засмуціў рэдактараў іншага дзяржаўнага выдання — газеты «Звязда». У той самы дзень на першай паласе «Звязды» таксама была надрукаваная праграма кандыдата Лукашэнкі з тым самым фота — мяркуючы па ўсім, адрэтушаваным ад пачатку, бо на твары незаўважна аніводнай зморшчынкі. Адна ку «Звяздзе» кіраўнік Беларусі выглядаў натуральней.

**Алесь Пілецкі**

## Самалёт садзілі на падушку з пены

У аэрапорце «Мінск–2» у самалёта «Фокер–100» пры пасадцы не выйшла шасі

Ахвяр няма.

Самалёт належыць «Аўстрыйскім авіялініям» — адной з самых надзейных кампаній.

12 пажарных машынаў было прыцягнута, каб стварыць падушку з пены, на якую і сядаў самалёт.

На борце рэйса Вена—Мінск было 85 асобаў: 81 пасажыр і 4 члены экіпажа. Паводле папярэдняй інфармацыі, аварыйная пасадка адбылася ў сувязі з нявыхадам левай стойкі шасі.

Можна лічыць цудам, што ніхто не пацярпеў.

У беларускім прадстаўніцтве «Аўстрыйскіх авіяліній» «НН» паведамілі, што наступны ранішні рэйс з Мінска ў Вену быў адменены. Прычыну не тлумачылі, але відавочна, што звязана гэта з аварыйнай пасадкай «Фокера».

**Кастусь Матушыч**

### Сціслa

• **У Гомелі павесіўся 11-гадовы школьнік.** Крымінальная справа распачата па факце яго гібелі. Хлопчык павесіўся ў сваім пакоі на клямцы пасля таго, як прыйшоў са школы і зрабіў урокі. Дзіця пакінула перадсмяротную запіску, змест якой не абвяшчаецца. Хлопчык выхоўваўся ў пасьпяховай сям’і, добра вучыўся.

• **Жыхар Узды спрабаваў згвалціць дзвюх жанчын.** 25-гадовы жыхар пасёлка Першамайск напаў на 21-гадовую і 22-гадовую дзяўчат. Пры гэтым ён збіў яшчэ адну жанчыну, якая спрабавала яму перашкодзіць.

**СМ**

КРЫМІНАЛ

## У Мінску арудавала пскоўская банда

Спачатку знік прадавец BMW X5 Андрэй Барысаў.

Ён размясціў у інтэрнэце аб’яву аб продажы аўто і паехаў яго паказаць патэнцыйным купцам. Сустрэчу прызначылі ля метро «Каменная Горка», побач з людным будмаркетам «Мацярык». З той пары Андрэя больш ніхто не бачыў.

Міліцыя звязвае знікненне з дзейнасцю пскоўскіх бандытаў. Чацвёра ўраджэнцаў Пскоўскай вобласці адзначыліся ў беларускай сталіцы яшчэ месяц таму. Двое маладых людзей, нібыта здымаючы кватэру на суткі, пад пагрозай пісталета збілі і звязалі скотчам сямейную пару. Бандыты адабралі ў іх грошы, нэтбук і мабільнікі.

Высветлілася, што гэта справа рук ураджэнцаў Пскоўскай вобласці, якія раз’язджаюць на джыпе BMW X5 серабрыстага колеру 2001 года выпуску з расійскімі нумарамі. Аўтамабіль, дарэчы, быў выкрадзены бандай у Маскоўскай вобласці. Пасля ўчыненых злачынстваў у сталічным рэгіёне Расіі маладыя людзі былі заўважаныя і ў Піцеры. Там яны, уцякаючы ад міліцыі, учынілі перастрэлку, параніўшы аднаго з праваахоўнікаў. Пры гэтым пацярпеў выпадковы мінак. Вядома, што па дарозе з Расіі ў Мінск гастралёры ўчынілі злачынствы ў Полацку.

У Мінску з тэлефона-аўтамата на станцыі метро «Каменная Горка» злачынцы тэлефанавалі прадаўцам BMW X5, якія давалі аб’явы ў інтэрнэце, і прапаноўвалі сустрэцца на стаянцы побач з будмаркетам «Мацярык».

Амаль ніхто з прадаўцоў не змог у той дзень паказаць свой аўтамабіль. Адзін са шчаслічыкаў усё ж прыехаў да «Мацерыка», праўда, бандытам яго машына не спадабалася. Пасля сваё аўто ім паказаў Андрэй Барысаў, які бясследна знік. Не знойдзена і машына.

Першы прадавец, джып якога банда не ўпадабала, апазнаў па фота пскоўскіх злачынцаў. Пакуль яны застаюцца няўлоўнымі. Міліцыя папярэджвае прадаўцоў дарагіх аўто — лепш пачакаць з продажам. Праўда, цяпер машына злачынцам нейкі час не спатрэбіцца, калі яны і сапраўды завалодалі чорным BMW X5 2005 года выпуску, які належыць Андрэю Барысаву.

**Naviny.by**

## Справа аб выбуху на 3 Ліпеня: падманны след

Больш за год правяралі 23–гадовага жыхара Маладзечна.

Нагадаем: у выніку выбуху падчас канцэрта 4 ліпеня 2008 года пацярпелі 54 чалавекі.

Як стала вядома інтэрнэт-газеце Naviny.by, падазрэнні ў арганізацыі выбуху з маладога чалавека знятыя, аднак наогул пазбегнуць крымінальнай адказнасці яму не ўдалося. У дачыненні да яго распачатая справа па артыкуле Крымінальнага кодэкса, звязаным з незаконным захоўваннем боепрыпасаў.

Гэтая крымінальная гісторыя пачалася яшчэ 10 чэрвеня 2009 года.

Выбух адбыўся ў 00.26 4 ліпеня 2008 падчас канцэрта каля стэлы «Мінск — горад–герой». Бомба была змешчаная ў двухлітровы пачак з–пад апельсінавага соку «Садочак» з надпісам ад рукі «5700». Унутры, як высветлілі эксперты, знаходзіліся: кітайскі будзільнік, драты, батарэйкі, 700–грамовая сумесь выбуховага рэчыва і гайкі. У выніку выбуху па дапамогу да медыкаў звярнуліся 54 чалавекі, з іх 47 былі шпіталізаваныя.

«Да таго часу, пакуль выбух, які адбыўся 4 ліпеня, не будзе раскрыты, я не лягу спаць і не сыду ў адпачынак з чыстым сумленнем», — абяцаў 30 снежня 2008 міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў. Цяпер ён ужо не міністр, і навукоўцы з медыкамі нават не дапускаюць, каб чалавек мог так доўга абыходзіцца без сну.

З Маладзечанскай цэнтральнай райбальніцы ў міліцыю паступіла паведамленне аб тым, што ў гэтую ўстанову са сваёй кватэры даастаўлены рабочы аднаго з мясцовых прадпрыемстваў. Малады чалавек быў шпіталізаваны з траўмамі правай кісці і ампутацыяй трох пальцаў.

Папярэдне было высветлена, што ў руках хлопца выбухнуў... звычайны аднаразовы шпрыц, у якім знаходзілася нейкае рэчыва. Сам жа пацярпелы казаў пра сваю няўдалую спробу вырабіць феерверк. Пасля таго як дамарослы піратэхнік назваў гэтыя рэчывы, ім шчыльна заняліся супрацоўнікі Упраўлення крымінальнага вышуку МУС. Малады чалавек паведаміў, што «феерверк» ён рабіў з электраліту, ацэтону і гідраперыту. Апошнія два кампаненты ўваходзілі ў склад выбухной прылады, якая і спрацавала ў ноч на 4 ліпеня 2008 у Мінску.

У распараджэнні Naviny.by знаходзіцца памятка для супрацоўнікаў МУС, якія ўдзельнічалі ў мерапрыемствах па пошуку падрыўніка. З яе вынікае, што для вырабу бомбы, што выбухнула падчас святочнага канцэрта, выкарыстоўваліся: гайкі, папера для крэслення, форма пад заліванне, фольга харчовая, перакіс вадароду, ацэтон, таблеткі гідраперыту. У ліку асобаў, на якіх неабходна звяртаць асаблівую ўвагу, называліся грамадзяне, «якія цікавяцца, вырабляюць, захоўваюць выбуховыя рэчывы, піратэхнічныя сумесі, самаробныя выбухныя прылады».

У кватэры маладзечанца правяліператрус, але, акрамя слядоў невялікага выбуху, нічога не знайшлі. Аднак аператыўнікам удалося разгаварыць маці пацярпелага. Жанчына прызналася, што пасля таго як сына павезлі ў шпіталь, яна сабрала ў пакет усе яго «феерверкі» і выкінула іх у найбліжэйшы смецевы кантэйнер.

Рэчавыя доказы дурасці яе сына са сметніцы з асаблівай асцярожнасцю дасталі спецыялісты групы размініравання. У пакеце знаходзіліся чатыры аднаразовыя шпрыцы з заплаўленымі месцамі мацавання іголак, у якіх знаходзілася рэчыва белага колеру і папяровыя клакі.

Крыміналісты высветлілі і тое, пра што змаўчаў пацярпелы піратэхнік: выбуховае рэчыва было выраблена на аснове трыацэтонтрыпераксіду. Заўпраўленыя такім адчувальным начыннем шпрыцы маглі выкарыстоўвацца як самастойныя бомбы, так і ў якасці дэтанатараў для асноўнага зараду, які складаецца, напрыклад, з гексагену, які ў сваіх мэтах не раз выкарыстоўвалі тэрарысты па ўсім свеце.

На падставе гэтых матэрыялаў і была распачатая крымінальная справа па факце «незаконных дзеянняў у дачыненні да выбуховых рэчываў».

Усё яшчэ нічога новага і пра ход следства па рэзананснай справе аб выбуху 4 ліпеня 2008. У праваахоўных органах традыцыйна адказваюць: «Следства працягваецца...»

**Паводле Naviny.by**

# Лукашэнка 4.0

Працяг са старонкі 2.



## Парушэнні апазіцыі

«Ніколі ў нашай краіне не было, каб парламент і прэзідэнта выбіралі недэмакратычна, — у лоб запэўніў Лукашэнка міністраў замежных справаў Польшчы і Германіі. — Я ўжо адкрыта сказаў: заплюшчыце вочы на ўсе парушэнні з боку апазіцыі», — дадаў ён.

І праўда, выбары будуць нічым не горшыя за папярэднія. Апазіцыянераў у выбарчых камісіях — 0,25%.

Няма зменаў і ў медыях.

Апазіцыйных кандыдатаў выпусцяць на экраны ў выглядзе гаворачых галоваў — роўна столькі разоў, колькі таго патрабуе лібералізаваны выбарчы кодэкс, і ні разу болей.

Апазіцыя патрэбна, бо Захад гэтага хоча, — наўпрост кажа Лукашэнка для ўнутранай аўдыторыі. «Вы толькі падумайце рыпнуцца!» — заключаюць для сябе чыноўнікі.

Нават калі выняць з гэтай жалезабетоннай канструкцыі ідэальнай дыктатуры адзін з элементаў, то ўсё адно іншых элементаў досыць, каб атрымаць элегантны вынік.

Шараговы беларус памятае, што савецкі НЭП змяніўся рэпрэсіямі.

## Як прабіць бетон

«Уласнай галавой!» — казаў Пілсудскі.

Але плана, у якім месцы біць, няма. Таму апазіцыя ідзе на выбары раздробленай і б'е як гарох аб сцяну.

Кожны разлічвае сваім удзелам прарэкламаваць уласную арганізацыю. Ці ідэалогію. А калі няма ні арганізацыі, ні ідэалогіі, то хоць персону.

Доўгачасовы лідар беларускай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч вылучаць сваю кандыдатуру адмовіўся: «Не хачу ўдзельнічаць у спектаклі, дзе ўсё вызначае адзін рэжысёр».

Аднак байкот лічыцца бясплённым. Таму ліберальна-кансерватыўны лагер выставіў кандыдатаў, хоць і малавядомых. Кансерватар Рыгор Кастусёў, хрысціянскі дэмакрат Віталь Рымашэўскі і лiберал Яраслаў Раманчук — ніводзін з іх нават не быў лідарам у сваіх партыях.

Быў адзін чалавек, здольны з'яднаць апазіцыю, зацяты праціўнік Лукашэнкі — прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч. Ветэран вайны ў Афганістане, ён абвясціў у сваім гарадку, што на мяжы з Польшчай, вайну карумпаваным падаткавікам і міліцыі. Ён быў гатовы да сілавых дзеянняў. За год да выбараў яго пасадзілі ў турму.

Нават калі нейкі з гэтых новых твараў здолее спадабацца грамадзянам, які чынам даказаць перамогу? Адзіную сацыялагічную службу, здольную правесці экзіт-пол, лукашэнкаўцы блакіравалі праверкай фінансавай паліцыі.

## Гавары праўду

І ёсць трэцяя сіла. Называецца «Кампанія «Гавары праўду». «Гавары праўду, адкуль грошы?» — жартуюць у апазіцыі.

Ніхто не ведае. Хадзілі ўпартыя чуткі, што з Расіі.

Лукашэнка таксама заявіў: «Уладзімір Някляеў, Андрэй Саннікаў — гэта людзі, якія сёння фінансуюцца Расіяй».

На чале «Гавары праўду» стаіць чалавек, які, здавалася б, меў бы найменш шанцаў на поспех у Крамлі. Уладзімір Някляеў, у мінулым — тэлевядучы, беларускамоўны паэт і аўтар эратычнага рамана.

Някляеў і Саннікаў выступаюць за паляпшэнне адносін з Расіяй. У праграме Лукашэнкі ані згадкі пра інтэграцыю з Расіяй няма.

Усе апошнія гады ён умела рабіў тое, што не ўдаецца расійскім дэмакратам. Ён падрываў аўтарытэт Пуціна. Лукашэнка ўмее гаварыць з насельніцтвам Расіі зразумелай яму моваі. Ён яшчэ і падважвае СНД з сярэдзіны самім фактам непадпарадкавання.

Захад па-ранейшаму разглядае Расію як патэнцыйнага праціўніка, таму пачынае Лукашэнку цаніць.

Лукашэнка зарабляе палітычны капітал на супрацьстаянні з Расіяй.

## Расія і Захад памяняліся месцамі

«Расія і Захад на гэтых выбарах памяняліся месцамі», — кажа Віталь Сіліцкі, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.

Самы моцны сігнал падала прэзідэнтка Літвы Даля Грыбаўскайце. «Лукашэнка з'яўляецца гарантам эканамічнай і палітычнай стабільнасці і яе незалежнасці», — быццам бы заявіла яна на закрытай сустрэчы з пасламі краін Еўрасаюза.

Пасля заявы Грыбаўскайце на апазіцыйных сайтах у Беларусі закіпела: «Политическая проституция Европы!» — гарачацца каментатары «Хартыі-97».

Лідары грамадзянскай супольнасці таксама баяцца здрады Захаду. Баяцца застацца сам-насам з аўтарытарызмам — забытымі, замоўчанымі.

Раней Масква казала пра Лукашэнку: сукін сын, але наш сукін сын.

Цяпер польскія і літоўскія дыпламаты ў Мінску наперабой распытваюць мясцовых экспертаў: ці гатовы Лукашэнка функцыянаваць ва ўмовах кіраванай дэмакратыі? Ці гатовы ён захоўваць уладу і захоўваць прыстойнасці адначасова?

«Прызнанне ці непрызнанне выбараў мусяць вызначацца не разлікамі, а выключна самімі выбарамі», — кажа палітолаг Сіліцкі.

## Маленькі мінскі Цяньаньмэнь

Папярэдняя перамога, 2006 года, цяжка далася рэжыму. Тады моладзь у лютыя марозы самаахвярна выйшла на Плошчу. І не сыходзіла з заснежаных намётаў, пакуль амон не ўзяў іх штурмам. То быў маленькі мінскі Цяньаньмэнь. Але — заслуга Мілінкевіча ў тым ліку — бяскроўны.

Лукашэнка тады ад нервовага напружання заламаўся, знік з экранаў на доўгія тыдні. Нават інаўгурацыю двойчы пераносілі. Нарэшце выйшаў на яе. Дзяржаўныя газеты выйшлі са здымкамі рэтушаванымі. Але апазіцыя растыражавала стоп-кадры з канала «Еўраньюс», на якіх у Лукашэнкі чорныя мяшкі пад вачыма. Ніхто так і не ведае, на што тады захварэў «гарант канстытуцыі».

Філосаф Валер Булгакаў лічыць, што менавіта тая безнадзейная, здавалася б, адчайная Плошча змусіла рэжым задумацца пра змены. Ён пабачыў, што рэсурс голай рэпрэсіі вычэрпваецца.

## Турма на грошы ЕС

І аўтар гэтых радкоў трапіў за краты ў 2006-м разам з усімі.

Турма была даволі камфартабельная, наколькі можа быць зручнаю вязніца. Збудавана яна была часткова на грошы Еўрасаюза з праграмы TACIC. Што праўда, яе не ацяплялі і коўдраў не давалі. Тэмпература там вагалася блізка нуля. На кожных нарах мы спалі па двое, і самыя марозныя ночы я штопаўгадзіны прачынаўся ад холаду і кружляў па камеры, каб сагрэцца, а тады зноў клаўся падрамаць яшчэ.

Для поўнага камфорту еўрапейцам трэ было б яшчэ плаціць за газ для Беларусі, тады б камеры з палітвязнямі належна ацяпляліся ў кожным выпадку.

## Hardware той жа

«Мы добрыя вучні, мы гатовы ў вас, еўрапейцаў, вучыцца ўсяму таму, што адпавядае інтарэсам беларускага народа, — сказаў Лукашэнка ў інтэрв'ю «Фігаро». — Але калі будзеце ставіць перад намі ўмовы, гэта палітыка ў нас ніколі не знойдзе разумення».

Калі што, Мінск можа зноў павярнуцца да Еўропы задам, а да Расіі перадам.

У адрозненне ад Януковіча, Лукашэнка падпісаў Мытны саюз з Расіяй і Казахстанам. Справа ідзе да падпісання дамовы пра Адзіную эканамічную прастору (АЭП).

АЭП, як і Мытны саюз — пешчаныя дзеці Пуціна. З дапамогай гэтых утварэнняў ён спадзяецца надзейна прывязаць беларускую і казахскую эканоміку да Расеі. Ён мяркуе, што такім чынам з часам створыцца «расейскі свет», альтэрнатыўны Еўрасаюзу.

Далучэнню Беларусі да АЭП папярэднічаў ціск з мэтай прымусіць Лукашэнку падпісаць нявыгадныя для Беларусі пагадненні аб Мытным саюзе. Спачатку Беларусь адмовілася тое зрабіць, але пасля дэманстрацыі на НТВ першага з фільмаў «Хросны бацька» Лукашэнка паставіў свой подпіс пад пагадненнем.

Масква фарсіравала перамовы пра АЭП увосень. Яна разлічвае, што перад выбарамі Лукашэнка будзе схільны да саступак.

Афіцыйны Мінск ніколі не разглядаў магчымасці адмовіцца ад будавання адзінай эканамічнай прасторы з Расіяй на карысць еўраінтэграцыі.

Software мяняецца, але hardware той самы.

## Ён баіцца Расіі

10 гадоў таму Беларусь была самай прарасейскай і адной з самых недэмакратычных краін былога СССР. Сёння гэта ўжо не так.

Таму клішэ, нібы апазіцыя ў Беларусі бяссільная ці што ніякая палітыка Захаду ў Беларусі — ані палітыка ізаляцыі, ані палітыка ангажавання — не мела поспеху, гэта памылкі. Наадварот, Захад праяўляў і цвёрдасць, і гнуткасць у патрэбнай меры, у патрэбны час. А апазіцыя дабілася рэалізацыі многіх сваіх задач.

Раней многія ўспрымалі яго як ірацыянальнага дыктатара, Калігулу з хакейнай клюшкай. Лукашэнка даказаў, што можа змяняцца.

Калі нафта і газ пацякуць у абыход Беларусі праз «Паўночны паток» і нафтаправод БТС-2 — а тое здарыцца ўжо ў 2012 годзе, — эканамічная эвалюцыя павядзе Лукашэнку далей на захад.

У сваёй праграме Лукашэнка гаворыць пра разнявольванне ініцыятывы і нават свабоду: «Будзе дазволена ўсё, што прама не забаронена». Але ў праграме няма ні слова пра нацыянальную культуру і беларускую мову. А таксама ні слова пра дэмакратыю і падзел уладаў.

Кандаліза Райс у свой час назвала яго «апошнім дыктатарам Еўропы». Ён хоча стаць першым дыктатарам Еўропы — маўкліва прынятым. Ён гатовы быць кліентам Захаду, пры ўмове што ад яго не будуць патрабаваць занадта.

Ён хоча, каб Захад прыняў яго такім, якім ён ёсць.

Беларускаму грамадству трэба быць гатовымі: часова яго могуць прыняць на Захадзе такім, які ён ёсць. Падкрэсліваю: часова.

Без дэмакратыі і без мовы Беларусь не стане еўрапейскай нацыяй.

# Хто перамог у тэлевыступах?

Вынікі першага тура.

Апазіцыю на Беларускім тэлебачанні паказваюць часта. Але вось слова ёй даюць раз на пяць гадоў — падчас прэзідэнцкіх выбараў.

Выступы кандыдатаў па БТ былі топавымі тэмамі мінулага тыдня. Наколькі ўдалося кандыдатам знайсці новых прыхільнікаў?

Каб скласці рэйтынг кандыдацкіх выступаў, «НН» зладзіла мініdаследаванне: дзесяці журналістам прапаноўвалася ацаніць выступ кожнага з прэтэндэнтаў па 10-бальнай шкале. З іх ацэнак выводзіўся сярэдні бал.

Таксама мы звярнуліся да палітолага і медыяаналітыка Уладзіміра Падгола з просьбай прааналізаваць выступ кожнага з кандыдатаў. Часам яго меркаванні кардынальна адрозніваюцца ад адзнакі.

Таксама ніжэй прапаноўваюцца самыя яркія моманты выступаў і палітычныя абяцанні.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Рымашэўскі на мітынгу 24 лістапада.

## Уладзімір Някляеў,

паэт, лідар грамадскай кампаніі «Гавары праўду», 64 гады.

**Сярэдні бал:** 8,1.

**Характарыстыка «НН»:** У кандыдата была актыўная міміка і жэстыкуляцыя. Часам гэта нагадвала не прамову прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта, а выступ публіцыста ды нават шоу-артыста. Былі шматлікія пераходы з беларускай на расійскую і наадварот. Часам Някляеў зазіраў у падрыхтаваныя загадзя паперы, але асабліва не злоўжываў.

**Афарызм ад Някляева:** «Чыноўніка венікам — кыш. І сядзіць як мыш».

**Што абяцаў:** Слухаць людзей. Сябраваць з Расіяй, але не за кошт абвастрэння адносінаў з Еўрасаюзам. Вывесці вёску з залежнасці ўлады. Выплачваць грашовую дапамогу не толькі на народжанае дзіця, але і мацяркам. Прадпрыемствы таксама вывесці з дзяржаўнага кантролю. Арыентавацца на «лідарскія гаспадаркі» — прадпрыемствы, якія ўзначальваюць менеджары-звышпрафесіяналы. Немагчымасць вярнуцца ў дыктатуру. Пры канцы выказаў падзяку Лукашэнку за незалежнасць, захаванне сацыяльных гарантый і эканомікі.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:

**Забудзься на паперкі.**

Калі я пачынаў слухаць Някляева, то ў мяне аж дух займала. Вось ён пераможа Лукашэнку! Так таленавіта, прыгожа. А потым як крыкне: «Галасуйце за Някляева», што ўсё адразу знікае. Гэта як «Галасуйце за Гамлета!». Калі выступаеш на тэлебачанні, забудзься на паперкі, агалі сваю душу, сэрца. Няхай абзацы не будуць такімі стройнымі. Нашы ж усе ў паперку глядзяць. Адразу ўзнікае думка: не веру! Тэлебачанне як рэнтген душы. Гэта на радыё можна выступаць як заўгодна.

## Мікола Статкевіч,

былы вайсковец, старшыня аргкамітэта сацыял-дэмакратычнай партыі «Народная грамада», былы палітвязень, 54 гады.

**Сярэдні бал:** 7,7.

**Характарыстыка «НН»:** Статкевіч прывабіў гледачоў тым, што не імкнуўся гаварыць завучанымі фразамі. Казаў простымі даступнымі словамі. Нярэдка Статкевіч браў на ўзбраенне рыторыку Лукашэнкі.

**Афарызм ад Статкевіча:** «Права на шчаслівае дзяцінства маюць усе дзеці, а не адзін Коля».

**Што абяцаў:** Прыцягненне міжнародных інвестыцый і высокіх тэхналогій. Развіццё малога бізнесу. Грошы ўкладваць не ў восем спецслужб, а ў інфраструктуру — дарогі, сувязь. Пенсію жорстка прывязаць да сярэдняга заробку. Вяртанне савецкіх укладаў. Ільготы дзецям і пенсіянерам.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:

**Трэба было сказаць, якой будзе дзяржава.**

Статкевіч не выкарыстаў той патэнцыял, які мае. Пачаў адразу заклікаць людзей на Плошчу. А ты дакажы спачатку, што ты лепшы, мудрэйшы, дасціпнейшы за Лукашэнку. Ты мусіш вырасці ў некалькі разоў над Лукашэнкам, каб людзі за табой пайшлі. Статкевіч умее выступаць лепш, з усмешкай, жартамі. Яму трэ было сказаць, якой будзе дзяржава. А ён мог гэта запраста зрабіць.


PHOTO.BYMEDIA.NET

Статкевіч (злева) і Някляеў.

## Віталь Рымашэўскі,

сустаршыня Беларускай Хрысціянскай Дэмакратыі, намеснік дырэктара «Хрысціянскай дзелавой ініцыятывы», 35 гадоў.

**Сярэдні бал:** 7,5.

**Характарыстыка «НН»:** Плюсам Рымашэўскага было тое, што ён выступаў першым. Не заўсёды поглядам трапляў укамеру, але браў сваё дзёрзкасцю і імпэтам. Хоць часам збіваўся на лозунгі. Шмат каму не спадабалася празмерная рэлігійнасць выступу, але на тое ён і хрысціянскі дэмакрат.

**Афарызм ад Рымашэўскага:** «Абіралі прэзідэнта, а абралі цара».

**Што абяцаў:** Прадпрыемствамі павінны кіраваць прафесіяналы, а не проста людзі, лаяльныя да ўлады. Высокія пенсіі за кошт адлічэння на карысць пенсійнага фонду 20% акцый буйных беларускіх прадпрыемстваў. Сацыяльна-арыентаваную рынкавую эканоміку. Адмену пошлін на замежныя аўтамабілі. Адміністрацыйна-тэрытарыяльную рэформу (23 вобласці). Зменшыць цэны на жыллё. Бясплатную адукацыю. Прафесійнае войска. Заробкі афіцэраў не меншыя, чым у спецслужбах.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:

**Ёсць вялізнае жаданне, але няма яснага разумення.**

Спадабаўся. Рымашэўскі як юніёр у вялікай палітыцы. Ёсць вялізнае жаданне, але няма яснага разумення пра лёс краіны. Людзям ён таксама імпане: сімпатычны, класны, але галасаваць за яго не будуць. Бо не бачаць у ім пакуль жыццёвай мудрасці. Як дэпутат парламента ён бы лёгка выйграваў у любога канкурэнта па сваёй акрузе.

## Андрэй Саннікаў,

былы намеснік міністра замежных справаў, каардынатар грамадскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь», 56 гадоў.

**Сярэдні бал:** 7,1.

**Характарыстыка «НН»:** Прамова была добра падрыхтаваная. Чытаў Саннікаў яе ўпэўнена. Падкрэсліў, што ён прафесійны дыпламат. І выглядаў ён як дыпламат. Анархічная барада была акуратна падстрыжаная. Выступ быў такім жа

папулісцкім, як і выступы Рымашэўскага і Статкевіча. Але яму бракавала яркіх момантаў і эмацыйнасці гэтых палітыкаў.

**Афарызм ад Саннікава:** «Трэба ўзяць палку і выгнаць свінню са свайго гарода».

**Што абяцае:** Да змены ўладаў засталося некалькі тыдняў. Першы ўказ — па змене кантрактнай сістэмы. Моцныя прафсаюзы. Са школьных падручнікаў прыбяром ідэалогію. Служба ў арміі стане сапраўднай школай для беларускіх мужчын. Адкрытае абмеркаванне чарнобыльскай праблемы. Прадукты сельскай гаспадаркі — на еўрапейскі рынак. Дзяржслужачым і бізнесоўцам прапаноўваў зрабіць свой выбар ужо зараз, каб не было позна.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:
**У Саннікава быў найбольшы сярод усіх кандыдатаў патэнцыял, каб вырасці ў дзяржаўнага мужа.** Але ён засяродзіўся на абсалютна лакальных праблемах. Каб ён змог падняцца з гэтага ўзроўню, то перакрыў бы ўсё. Не ўдалося.


Саннікаў у Слуцку.

## Яраслаў Раманчук,

эканаміст, намеснік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі, 44 гады.

**Сярэдні бал:** 6,9.

**Характарыстыка «НН»:** Раманчук першы выкарыстаў на БТ наглядную агітацыю: прыйшоў з вялікім жоўта-зялёным плакатам «Мільён новых рабочых месцаў». У куце экрана стаяла двухмоўная застаўка «Пабудуем новае, захаваем лепшае». Гэта была выдатная знаходка. Наступныя выступоўцы за яе схапіліся. Гаварыў кандыдат хуткавата, трохі сумбурна, але лёгка і ўпэўнена. Расказваў пра розныя рэчы на простых жыццёвых прыкладах.

**Афарызм ад Раманчука:** «У нас краіна салаўёў–разбойнікаў».

**Што абяцае:** Беларусь вартая таго, каб ісці разам з лідарамі сусветнай эканомікі. Прапануе захаваць чалавечы капітал. Запавольць бег людзей з краіны. Наладзіць прыдарожны сэрвіс. Змагацца з бюракратыяй. Стварыць інфраструктуру побач з беларускімі азёрамі. Дэклараваў, што «на зямлі павінен быць гаспадар». Вярнуць пенсіянерам ільготы на транспарт. Даць магчымасць пенсіянерам адпачываць на беларускіх базах адпачынку.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:
**Разумнік. Класны хлопец. Але не прэзідэнт, дарадца прэм'ер-міністра.** Усё гэта здарова, ліберальная эканоміка і г.д. Але чаму ты не кажаш пра АДКБ, пра саюз з Расіяй, пра іншыя важныя рэчы?

## Рыгор Кастусёў,

намеснік старшыні Партыі БНФ, 53 гады.

**Сярэдні бал:** 5,2.

**Характарыстыка «НН»:** Адчувалася, што вопыту публічных выступаў у яго няма. Гаварыў ён цвёрда, ясна, але не рабіў сэнсавых паўз між часткамі свайго выступу. Пераважна чытаў тэкст з паперкі.

**Афарызм ад Кастусёва:** «Хто не краў, той не сядзе».

**Што абяцае:** Вярнуць бел-чырвона-белы сцяг. Фармаванне ўрада народнага даверу. Скасаванне дзяржманаполіі на тэлебачанне. Роспуск КДБ. Мараторый на смяротнае пакаранне. Мыта на ўвоз аўтамабіляў не павінна павышацца. Стварэнне агенцтва па прыватызацыі. Увядзенне новай валюты — талера. Спрошчванне падатковай сістэмы. Вяртанне ЕГУ на Радзіму. Энергетычная незалежнасць. Адраджэнне мовы.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:
**На нашых вачах нараджаецца новы лідар.** Усе казалі, што ён тэхнічны кандыдат пад Мілінкевіча. А ён узяў і выйшаў. Такі мужыкаваты троху, каржакаваты, але пачаў казаць простыя і мудрыя рэчы. Калі будзе прагрэсіраваць далей, то выйдзе варты палітык. Хаця без мінусаў не абышлося і ў яго. Напрыклад, не трэба было гаварыць пра люстрацыю.




Кастусёў (зверху) і Міхалевіч.



## Алесь Міхалевіч,

старшыня арганізацыі «За мадэрнізацыю», 35 гадоў.

**Сярэдні бал:** 4,4.

**Характарыстыка «НН»:** Відавочна, што кандыдат хваляваўся. Складвалася ўражанне, што без зазірання ў шпаргалку ён не мог успомніць нават сваю біяграфію. Нярэдка папраўляў акуляры, запінаўся. Уменню трымацца перад відэакамерамі яму яшчэ трэба вучыцца. Другі выступ выйшаў значна лепшы за папярэдні. Спрабаваў гуляць на нетрадыцыйным для апазіцыі полі, але няўдала.

**Афарызм ад Міхалевіча:** «Хроснага бацьку» глядзеў. Не ўразіла».

**Што абяцае:** Рэформа мясцовага самакіравання. Калі Мытны саюз выгадны, то выходзіць не будзем. Не палохаюць расійскія інвестыцыі. Прыватызацыя — не самамэта. Кожны вайсковы афіцэр атрымае дом па выхадзе на пенсію. Прыватная ўласнасць на зямлю. Уступленне ў ЕС нерэальнае. Негатыўнае стаўленне да парламенцкай рэспублікі. Колькасць міліцыі застанецца ранейшай. Пенсіі расці не будуць. Забарона на «чарніла».

Меркаванне Уладзіміра Падгола:
**Замест Міхалевіча можна было пасадзіць кібарга нейкага з выявай Міхалевіча, каб ён усё гэта агучыў.** Быў бы той самы эфект. Эмоцыяў няма, сэрца, душу не кранае. Адзінае, чаго ён дасягнуў, — выбаршчыкі пераканаліся, што гэты кандыдат — не чорт з рагамі і не тэрарыст.

## Віктар Цярэшчанка,

эканаміст, 60 гадоў.

**Сярэдні бал:** 3,4.

**Характарыстыка «НН»:** Глядзеў не ў камеру, нібы размаўляў з кімсьці ў студыі. Гаварыў ён спакойна, ясна. Адзіны, хто абраў не жывы эфір. На першы погляд, яго выступ найперш быў адрасаваны людзям старэйшага пакалення, што яшчэ настальгуюць па вялікай дзяржаве. Шмат у чым ягоныя прапановы грунтаваліся на голым папулізме, але выгляд ён рабіў прыстойны.

**Афарызм ад Цярэшчанкі:** «Зробім курс рубля да даляра 1 да 1».

**Што абяцае:** Сістэма жорсткага ручнога кіравання сябе вычарпала. Развіццё не за кошт крэдытаў, а інвестыцый. Рубель трэба зрабіць вольна канвертаваным. Рост пенсій, заробкаў за кошт экспарту. Акцыі прадпрыемстваў пяройдуць рабочым. Аднавіць права найму работнікаў для ІП. Прыбыткі на сяле не меншыя, чым у горадзе. Прыкладзе намаганні, каб аднавіць адносіны з Расіяй.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:
**Гэта чалавек у статусе кандыдата ў прэзідэнты, але не верыць у сваю перамогу.** Ён не мае прагі атрымаць уладу, прыйсці да яе. Грае ў нейкі паўспектакль, паўпалітычную гульню. Не сапраўдны кандыдат. Ягоная мэта — адыграць сваю ролю.

## Дзмітрый Ус,

прадпрымальнік, 39 гадоў.

**Сярэдні бал:** 1,8.

**Характарыстыка «НН»:** Кандыдат так ні разу і не падняў вачэй на гледачоў. Прамова цалкам зачытвалася з паперак, якія ён мяняў. Было заўважна, наколькі цяжка яму даваўся гэты эфір. Прадпрымальнік увесь успацеў. У 2004 годзе Ус перанёс кому, наступствы якой так да канца і не пераадолеў.

**Афарызм ад Уса:** «Выбарчая сістэма ў Беларусі нагадвае гітлераўскую».

**Што абяцае:** Памяняць выбарчую сістэму. Аднавіць адносіны з «брацкай» Расіяй. Павялічыць працоўныя пенсіі за кошт даходаў Кіраўніцтва справаў прэзідэнта. Капітальны рамонт жылых дамоў. Падаткі павінны залежыць ад абаротаў прадпрыемства. Эфектыўныя агракомплексы, у тым ліку і аграгарадкі. Бясплатныя гурткі, секцыі для дзяцей.

Меркаванне Уладзіміра Падгола:
**Я спачатку шмат чаго нагаварыў пра Уса, але ўражце мне ягоны выступ спадабаўся.** Чалавек трапіў у жудасную сітуацыю, у ступар, але пераадолеў яго. У мяне склалася ўражанне, што бізнесовец праводзіць сваю нараду. Возьмем і ўдасканалім выбарчую сістэму. Дзелавы мужык прапанаваў шыкоўную справу.

**Зміцер Панкавец**

**Лукашэнка ад тэлевыступаў адмовіўся**

Дзейны кіраўнік дзяржавы не скарыстаўся сваім правам выступіць са зваротам ні на тэлебачанні, ні на радыё. Лукашэнка нібыта робіць «шырокі жэст». Насамрэч жа апазіцыю паказваюць раз на пяць гадоў, а Лукашэнка — на ўсіх каналах штодня. Між тым, добра выступіць у выглядзе «гаваркой галавы» на паўгадзіны — надзвычай складаная задача.

| | Паўлюк Быкоўскі | Руслан Гарбачоў | Дзмітры Гурневіч | Святлана Калінкіна | Аляксандр Класкоўскі | Віктар Марціновіч | Зміцер Панкавец | Вольга Хвоін | Віталь Цыганкоў | Вольга Шастакова | Вынік |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Някляеў | 9 | 7 | 7 | 7 | 9 | 10 | 6 | 9 | 9 | 8 | 8,1 |
| Статкевіч | 8 | 8 | 9 | 8 | 8 | 5 | 8 | 8 | 8 | 7 | 7,7 |
| Рымашэўскі | 7 | 7 | 7 | 8 | 8 | 9 | 7 | 8 | 7 | 8 | 7,5 |
| Саннікаў | 7 | 7 | 8 | 7 | 7 | 9 | 6 | 7 | 6 | 7 | 7,1 |
| Раманчук | 8 | 5 | 8 | 6 | 9 | 9 | 6 | 6 | 6 | 6 | 6,9 |
| Кастусёў | 6 | 5 | 6 | 5 | 5 | 4 | 5 | 5 | 6 | 5 | 5,2 |
| Міхалевіч | 7 | 3 | 5 | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 | 5 | 4 | 4,4 |
| Цярэшчанка | 7 | 3 | 4 | 5 | 3 | 0 | 2 | 3 | 4 | 3 | 3,4 |
| Ус | 1 | 3 | 2 | 2 | 2 | 0 | 3 | 2 | 1 | 2 | 1,8 |

У апытанні ўдзельнічалі **Паўлюк Быкоўскі** («Белорусы і рынок»), **Руслан Гарбачоў** (інтэрнэт–газета «Салідарнасць»), **Зміцер Гурневіч** («Белсат»), **Святлана Калінкіна** («Народная воля»), **Аляксандр Класкоўскі** (БелаПАН), **Віктар Марціновіч** («Белгазета»), **Зміцер Панкавец** («Наша Ніва»), **Вольга Хвоін** («Новы час»), **Віталь Цыганкоў** (радыё «Свабода»), **Вольга Шастакова** («Комсомольская правда в Беларусі»).

# Кандыдацкі «профіль»

**«Амстэрдам за Саннікава», «Вулічныя банды» Рымашэўскага, Міхалевіч «за вольны Тыбет»…. Кандыдаты асвойваюць сацыяльныя сеткі.**

Сацыяльныя інтэрнэт-сеткі падчас выбараў ператвараюцца ў агітацыйную платформу. Калі ў вас беларускамоўны блог, то ў сябрах з'яўляецца Някляеў, у «кантакце» вас дадасць у сябры Раманчук, а рэклама тут жа распавядзе пра Саннікава. «НН» даведалася, чым займаюцца кандыдаты ў сацыяльных сетках.

## Яраслаў Раманчук

**Facebook**

У «фэйсбуку» у Раманчука — 1300 «сяброў». Асноўны змест — кандыдат звяртаецца па парады да сваіх чытачоў і пытаецца, ці спадабаліся ім яго выступы на ТБ і радыё. З усіх кандыдатаў Раманчук вылучаецца зваротамі да мэтавай аўдыторыі — заклікае дзяліцца ідэямі і разам распрацоўваць уже існыя.

**Livejournal**

У «Жывым Журнале» існуе «Дыскусійны клуб Яраслава Раманчука» — суполка, якая налічвае 82 чалавекі. Аснова суполкі — навіны пра дзейнасць Раманчука, крытычныя артыкулы. Каментары амаль адсутнічаюць. Напаўняецца нерэгулярна. Мова — расійская.

Асабісты блог Яраслава Раманчука таксама ёсць, але ніводнага запісу ў ім няма.

**Vkontakte**

Суполка налічвае 9123 сябры. Сярод акцый унутры суполкі — «Задай пытанне Раманчуку», «Конкурс ЯРкая жаба» (стварэнне «фотажаб», звязаных з Раманчуком, асноўны прыз — 100 даляраў), «Не падабаецца Раманчук? Выкажыся тут!»

**Twitter**

Выглядае як стужка навінаў са спасылкамі на іншыя рэсурсы. Цяпер мікраблог кандыдата абнаўляецца радзей — да верасня актыўнасць была вышэйшай.

**Аднакласнікі**

Раманчук у сябрах у 33 чалавек. Старонка запоўненая фота кандыдата. Сярод іншага, прыхільнікі цікавяцца, калі ў кандыдата дзень нараджэння. А то ў адных крыніцах — 9 снежня, а ў іншых — 10.

## Уладзімір Някляеў

**Livejournal**

Асабісты блог Някляева папаўняецца раз на дзень. Апошні месяц палітыка — асноўны змест блогу, хаця дагэтуль траплялася і літаратура. Мова — беларуская. Някляеў сам удзельнічае ў абмеркаваннях.

Афіцыйны ЖЖ «Гавары праўду!» напаўняецца павольней, у асноўным аналітычнымі артыкуламі, анонсамі акцый і справаздачамі з іх. Колькасць сяброў — 342. Мовы: беларуская, руская.

**Vkontakte**

Колькасць сяброў суполкі «Гавары праўду!» — ля двух з паловай тысяч удзельнікаў. Сярод адметных акцый — «Прыдумай лозунг і атрымай iPhone», «Прыдумай крычалку і выйграй вячэру з Някляевым».

Асабісты профіль Някляева налічвае больш за 1000 сяброў. Там жа Някляеў час ад часу адказвае на пытанні, якія задаюць у каментарах. Тут жа знаходзяцца фота кандыдата. Профіль афармлены па-беларуску.

**Facebook**

Суполка «Гавары праўду» налічвае ля 900 сяброў. Добра прадстаўленыя песні на вершы Някляева — называецца ўсё гэта «Радыё Праўды». Тут жа праводзіцца конкурс фотажаб «Смяёмся з кандыдатаў», пра які карыстальнікі адгукаюцца як «дзіцячы сад працягваецца».

**Аднакласнікі**

Профілю Уладзіміра Някляева не знойдзена.

**Twitter**

У «твітары» існуе акаўнт «Гавары праўду»: пасты выглядаюць як загалоўкі газетных артыкулаў. У асноўным твітар напоўнены спасылкамі на інтэрнэт-відэа, кшталту «актывісты збіраюць грошы на білет у адзін канец у Венесуэлу». «Твітар» самога Някляева выглядае як самы звычайны блог з допісамі кшталту «Дзесяць хвілін да эфіру. Хвалююся», «Хвіліна». Складаецца ўражанне, што спадар Някляеў досыць шмат часу праводзіць на гэтым серверы.

## Віталь Рымашэўскі

**Facebook**

Негледзячы на тое, што ў Рымашэўскага ў сябрах значыцца 1404 чалавекі, яго допісы каментуюцца досыць сціпла — ды і нагадваюць яны стужку навінаў. Сярод сяброў Рымашэўскага ёсць і астатнія кандыдаты — дарэчы, паводле «фэйсбука», усе кандыдаты ў сябрах адзін у аднаго.

**Livejournal**

Блог Рымашэўскага складаецца з нататак пра ход выбараў, зваротаў да грамадства, а таксама спасылак на матэрыялы з афіцыйнага сайта. Каментарыяў мала — большасць допісаў не каментуецца ўвогуле. Сяброў у Рымашэўскага — 108, ён у сябрах у 49 чалавек. Афіцыйная суполка ў ЖЖ мае ля 50 сяброў. Абсалютная большасць пастоў — перадрук артыкулаў прэсы.

**Vkontakte**

Суполка прыхільнікаў Рымашэўскага тут налічвае 160 чалавек, суполка БХД — 320. Папаўняецца відэазапісамі, прысвечанымі Рымашэўскаму, а таксама абмеркаваннямі з назвамі кшталту «Беларусь — еўрапейская краіна», «Беларусь — заможная краіна» і «Беларусь — гэта свабода». Абмеркаванняў тэмы не выклікаюць.

Афіцыйная суполка БХД прысвечаная рэлігіі, перадвыбарнай актыўнасці тут менш, чым у канкурэнтаў. Мова — беларуская.

**Аднакласнікі**

Тут Рымашэўскі праяўляе большую актыўнасць — 420 сяброў. Вялікая калекцыя фота кандыдата. Але абмеркаванняў «гарачых тэм» амаль няма. Адметна — зарэгістраваны Рымашэўскі па-расійску. Таксама ён уваходзіць у суполку Саннікава «За нармальную Беларусь».

Рымашэўскі — адзіны з кандыдатаў, у каго ўсталяваныя анлайн-гульні кшталту «Вулічныя банды».

## Алесь Міхалевіч

**Facebook**

Некалькі сціплых фотаальбомаў. 850 чалавек у сябрах. Як і іншыя кандыдаты, Міхалевіч, знаходзячыся анлайн, не згаджаецца паўдзельнічаць у чат-размове з «сябрамі».

**Livejournal**

Блогаў у Алеся Міхалевіча два: адзін беларускамоўны, а другі — расійскамоўны. Сяброў у беларускага блогу — 1437 , у расійскага — 66.

**Vkontakte**

Тут Міхалевіч — рэкардсмэн па колькасці суполак, у якія ўступіў. Сярод іх, напрыклад, суполка «Мы за вольны Тыбет». Сяброў ён мае 367, старонка аформленая па-расійску. Пра тое, што Міхалевіч прэтэндуе на пасаду прэзідэнта, нагадвае толькі пункт «дзейнасць». Суполка Міхалевіча выглядае сціпла —абмеркаванняў усяго тры, прычым сам кандыдат у іх не ўдзельнічае. «Удзельнікаў» у суполцы — ля 400чалавек.

**Аднакласнікі**

Тут у Міхалевіча пад 300 прыхільнікаў, але фота закрытыя па прынцыпе «толькі для сяброў», а ў абмеркаваннях даўно нічога не з'яўлялася — тэмы вісяць з чэрвеня.

**Twitter**

Таксама нагадвае стужку навінаў, хоць час ад часу Міхалевіч ідзе на кантакт і дзеліцца спасылкамі на розныя відэа і артыкулы.

## Андрэй Саннікаў

**Facebook**




**Яраслаў Раманчук самы актыўны ў сацыяльных сетках. І самы экстравагантны ў акцыях. На фота — выкопвае слуп ля ўкраінскай мяжы, абяцаючы скасаваць межы, як стане прэзідэнтам.**

990 чалавек пазначылі Саннікава сябрам. Змест старонкі — тыповы. Кандыдат піша: «Быў ў Баранавічах, мы дакладна пераможам!» ці «Паглядзеў выступ Някляева. Здарова! Разам мы пераможам!». Праўда, не ўсе «сябры» Саннікава ставяцца да старонкі сур'ёзна: пад допісам «Заўтра ў 15.00 буду на Экспабел» адказваюць «Там распродаж — айда туды». Большасць наведнікаў — усё ж прыхільнікі кандыдата, нярэдка з'яўляюцца допісы кшталту «Амстэрдам за Саннікава!»

**Vkontakte**

Афіцыйных суполак у Саннікава некалькі: адна на расійскай мове (5 500 удзельнікаў) і на беларускай (680 удзельнікаў), прычым актывісты з першай заклікаюць сяброў другой перайсці на расійскую мову, бо некаторыя беларускай не разумеюць. Ды і пра «русіфікацыю» сайта Саннікава кажуць, што гэта было зроблена, каб ніхто не думаў, што кандыдат «які-небудзь там фанатык». Самыя «гарачыя» абмеркаванні прысвечаны тэмам вяртання дзяржаўнай сімволікі, а таксама ўдзелу ў Плошчы-2011.

Як і ў выпадку з суполкай Някляева, тут досыць лукашэнкаўцаў. Асабліва радасна выглядае тэма «Тэрміновае пытанне да Саннікава», якое тычыцца легалізацыі марыхуаны. Саннікаў не прымае ўдзелу ў дыскусіях, яго асабістая старонка належыць ініцыятыўнай групе.

**Livejournal**

Тут слядоў Андрэя Саннікава не знойдзена.

**Аднакласнікі**

Спасылкі на выступы, артыкулы з прэсы. Адчуванне, што ўсе 138 сяброў — ініцыятыўная група кандыдата: ніякіх прыкмет жывой размовы. Затое ў суполцы «За нармальную Беларусь» (719 удзельнікаў) абмяркоўваецца кожны рух кандыдата.

**Twitter**

Стужка навінаў з палітычнай дзейнасці кандыдата. Чытаюць амаль 2000 карыстальнікаў.

## Рыгор Кастусёў

**Facebook**

Старонка Кастусёва ў «фэйсбуку» існуе, але ёсць адчуванне, што спадар Рыгор ёй цікавіцца мала. Толькі перыядычна каментуе статусы сваіх сяброў. Прыхільнікі, а іх 467 чалавек, як могуць падбадзёрваюць кандыдата.

**Vkontakte**

«Сяброў» у спадара Рыгора зараз тры, прычым адзін з іх выдалены адміністрацыяй сайта (хутчэй за ўсё спам-бот). Затое пададзеныя кантактныя телефоны, што дзіўна і наводзіць на думку, што старонка ўсё ж такі — падробка.

Што цікава, у суполках БНФ спадар Кастусёў амаль і не ўзгадваецца, а вось пра байкот выбараў гаворка ідзе рэгулярна.

**Livejournal, Twitter, Аднакласнікі**

Тут слядоў дзейнасці Кастусёва не знойдзена.

## Віктар Цярэшчанка

**Аднакласнікі**

У суполцы «Сябры Віктара Цярэшчанкі» — 558 удзельнікаў. Тэмы нагадваюць перадавіцы дзяржаўных газет, з фармулёўкамі кшталту «дастойная змена». На ўсіх старонках фота кандыдата з пазнакай The Best. З профілю вынікае, што адзін з любімых заняткаў кандыдата — будаўнічыя працы (фотаальбом «Любімы занятак» прысвечаны пабудове студні на лецішчы).

**Vkontakte**

Тут у Цярэшчанкі ўсяго 12 прыхільнікаў. Адзіны камент на «сцяне» — «дастойны кандыдат».

**Facebook, Twitter, Livejournal**

Тут Віктара Цярэшчанкі не знайшлося.

## Мікалай Статкевіч

**Vkontakte**

Суполка Мікалая Статкевіча ёсць толькі тут. У спадара Статкевіча — 14 прыхільнікаў, якія лічаць яго «чоткім» (пасля выступлення на ТБ). Суполка напоўненая перадрукамі артыкулаў і інтэрв'ю Статкевіча, але абмеркаванняў матэрыялы не выклікаюць.

## Дзмітры Ус

У сацыяльных сетках адсутнічае.

**Юрась Ускоў**

**Сацыяльныя сеткі**

супольнасці па інтарэсах у інтэрнэце. Найбольш папулярныя ў Беларусі: Odnoklassniki.ru, Vkontakte.ru, Facebook.com, Twitter.com, Livejournal.com.

# У кабінеце Караткевіча вісеў партрэт Каліноўскага

26 лістапада Уладзіміру Караткевічу споўнілася б 80 гадоў.

Быў гэта чалавек вялікага таленту, але з уласцівымі для ўсіх людзей звычкамі і захапленнямі. Цяпер, калі аўтара «Каласоў...» і «Сівой легенды» ўжо больш за чвэрць стагоддзя няма сярод жывых, яго асоба стала легендай.

### Леаніды не вернуцца

Раман «Леаніды не вернуцца да Зямлі» аўтар напісаў у 1962 годзе. Надрукаваўшы скарочаны варыянт у часопісе «Полымя», раман разам з аповесцю «Дзікае паляванне караля Стаха» рыхтавалі да выдання пад адной вокладкай. Але набор кнігі рассыпалі, абвінаваціўшы аўтара ў «абстрактным гуманізме». І толькі ў пачатку 1980-х зноў вярнуліся да «Леанідаў...», каб нарэшце выдаць. Але акурат памёр Брэжнеў. І назву ўспрынялі як палітычны намёк. Раман тады выйшаў, але як «Нельга забыць».

Зусім іншая, амаль дэтэктыўная, гісторыя надарылася з рукапісам «Ладдзі роспачы», які захоўваўся ў Рыгора Барадуліна. Твор не друкавалі. Тады Васіль Сёмуха пераклаў яго на расейскую і апублікаваў у часопісе «Нёман». А калі з'явілася надзея надрукаваць па-беларуску, рукапіс не змаглі адшукаць. Караткевіч нават вырашыў з нёманскай публікацыі зрабіць пераклад на родную мову. Ды выручыў выпадак. «У Вушачы перагледаю паперы — рукапіс «Ладдзі роспачы». Прывожу. Адзначаем падзею, што знайшлася прапажа. Назаўтра спахопліваецца шчаслівы аўтар, а дзе ж рукапіс? Зноў шукаем. І ўрэшце за газаваю плітою ў маёй кватэры знаходзіцца рукапіс», — прыгадваў Рыгор Барадулін.

**Уладзімір Караткевіч**
(26.11.1930, Орша — 25.1984, Мінск). Паэт, празаік, драматург, сцэнарыст, эсэіст. Аўтар кніг «Матчына душа», «Чазенія», «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», «Зямля пад белымі крыламі» і іншых. Свамі гістарычнымі творамі здолеў звярнуць увагу чытача на мінуўшчыну.

### Вечны вандроўнік

Уладзімір Караткевіч быў захоплены асобай Кастуся Каліноўскага. На сцяне ў яго кабінеце вісеў нават партрэт нацыянальнага героя.

Пісьменнік усюды думаў пра сваю краіну. Рыгор Барадулін прыгадвае сумесную з Караткевічам стажыроўку ва Уладзівастоку, у рэдакцыі газеты «Баявая вахта». «...Было дужа няўтульна і нам, і з намі. Усе ў форме, ад апраткі да мыслення, а мы разгільдзяі ў цывільным, дый думкі не па статуце ў нас. ...А Уладзімір, сур'ёзна заклапочаны, пытаўся ў яго [рэдактара-вайскоўца], як бы гэта купіць вайсковы «газік», каб на ім ездзіць па Беларусі». Ён вандраваў заўжды. Нават перад смерцю знаходзіўся ў воднай вандроўцы па Прыпяці.

### Пісаў толькі цвярозы

Розныя гісторыі здараліся з Караткевічам праз гарэлку.

Старэйшыя пісьменнікі расказваюць, як Караткевіч мог падысці да сакратара ЦК Кузьміна і прапанаваць яму пігулкі, што адбіваюць пах алкаголю.

А Сяргей Законнікаў апісаў гісторыю, калі пісьменніку давялося нецвярозаму размаўляць з першым сакратаром ЦК КПБ Кісялёвым. Караткевіч «адмакаў» у ваннай і нават не зразумеў, з кім вёў гутарку.

Іншыя распавядаюць аб паездцы Пятра Машэрава па Мінску ў кампаніі з пісьменнікам. Некалькі гадзін Караткевіч распавядаў кіраўніку краіны пра гісторыю беларускай сталіцы.

Уладзімір Сямёнавіч быў розным у сваіх кнігах і ў паўсядзённым жыцці. І адмяжоўваў гэтыя два «занятки».

Пісьменнік хоць і любіў выпіць, але не дазваляў сабе сесці за пісьмовы стол нецвярозаму. Гэта быў асобны рытуал, як ён пісаў. Спачатку галіўся. Надзяваў чыстую адпрасаваную сарочку. Пісаў толькі на добрай паперы і дарагімі асадкамі. На стол абавязкова ставіў кубак кавы і клаў пачак папярос. Пісаць ён мог запоем, не выходзячы з дому па некалькі дзён. А калі выходзіў, яго заўсёды сустракалі з кнігай ці часопісам у кішэні.

**Сяргей Макарэвіч**



Адраджэнцы 1960-х бясконца вандравалі па краіне. На фота: Караткевіч (першы справа ад кабіны) у Давыд-Гарадку, на Гарыні, 1969 г. Крайні справа — малады Зянон Пазняк.

# Борат у Докшыцах

Саша Барон Коэн можа зняць новы фільм у Беларусі.



Амерыканскі актор-правакатар Саша Барон Коэн здымецца ў фільме «Дыктатар». Сыграе адразу дзве ролі: зрынутага дыктатара, які згубіўся ў чужой краіне, і казлапаса. Рэжысёр Лары Чарльз і студыя Paramount, якія здымаюць гэта кіно, арыгінальным спосабам спакусілі Коэна паўдзельнічаць у ім — паслалі яму двух жывых казлоў, начапіўшы на іх майкі з лагатыпам кампаніі. Ну як мог не пагадзіцца актор, чый хлеб — эпатаж?

Падрабязнасці сюжэта «Дыктатара» не раскрываюцца. Калі чуеш назву, адразу згадваецца культавы фільм Чапліна «Вялікі дыктатар». Коэн — нібы Чаплін сёння, з улікам вымогаў XXI ст.

Саша зарабіў славу псеўдадакументальнымі камедыямі. І ў фільме «Борат», які апавядае пра прыгоды казахскага журналіста ў ЗША, і ў фільме «Бруна», дзе аўстрыйскі тэлевядучы гей трапляе ў Галівуд, выкарыстоўваецца той самы камічны прыём. Частка ўдзельнікаў не ведае, што іх здымаюць у мастацкім фільме. І іх натуральныя рэакцыі на ўчынкі галоўнага героя насычаюць карціну фарбамі.

Напрыклад, тэлевядучы Бруна ў сваім жаданні праславіцца надумаўся спыніць арабаізраільскі канфлікт. І вось сядзяць за адным сталом ізраільскі міністр, прадстаўнік палесцінскай апазіцыі, а між імі — Бруна. «Я напісаў песню, паслухаўшы якую, вы дакладна перастанеце ваяваць», — кажа Бруна. І пачынае фальшыва пяяць нешта малавыразнае. А чыноўнікі і апазіцыянер не ведаюць, што ўсё зрэжысіравана. Яны думаюць, што да іх прыляцеў чарговы Ута Цапф. І нават трохі падпяваюць.

Поспех «Дыктатара» будзе залежаць ад таго, ці дадуць Коэну магчымасць і надалей вывучаць людзей, ці проста выкарыстаюць яго ў якасці раскручанага брэнда.

Апошні фільм Коэна пра рэпера Алі-Джы, дзе не было псеўдадакументалістыкі, глядзеўся як бяззубая казка.

Стужкі Коэна месцамі брутальныя да агіды. У многіх краінах іх не пускаюць у пракат, а абражаны Казахстан нават заяўляў пратэст пасля «Бората».

Наша краіна магла б, дарэчы, даць і выдатны матэрыял для наступнага фільма Коэна. На тыдні маладога журналіста Кастуся Шыталя ў вёсцы Глінная Докшыцкага раёна спрабавалі забраць у міліцыю, бо фатаграфаваў недагледжаныя хаты. Як бы рэагавалі старшыня сельсавета, каб да іх прыехаў эпатажны Коэн?

Але найбольш удзячнай для гэтага правакатара была б роля замежнага інспектара па інвестыцыях — дзяржслужбоўцы настолькі запалоханыя праверкамі, што праглынуць любы ідыятызм. Або роля амерыканскага эксперта, які прыехаў яднаць апазіцыю. Коэн такое ўмее.

Але ў яго ёсць свая краіна, і да нас ён «на блакітным верталёце» не прыляціць. Нашыя ж рэжысёры пакуль ладзяць такія тэсты для грамадства не наважваюцца.

Значыць, пакуль будзем глядзець амерыканскі фільм пра прыгоды вусатага дыктатара. Здымкі пачнуцца ў 2011-м.

**Сяргей Мікулевіч**

## Сцісла

• **Нясвіж можа стаць сталіцай СНД.** Праўда, пакуль толькі культурнай. Такі статус яму можа быць нададзены ў 2011 годзе, заявіў старшыня Мінаблвыканкама Барыс Батура. Ідэя вызначаць штогод культурную сталіцу СНД прагучала ўпершыню. Яна запазычана ў ЕС, дзе штогод вызначаюць дзве культурныя сталіцы Еўропы.

• **Запланавана выданне шматтомнай «Гісторыі Беларусі».** Інстытут гісторыі Акадэміі навук мае ажыццявіць яго ў 2011—2015 гадах. Пра гэта паведаміў выканаўца абавязкаў дырэктара гэтай установы, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў Даніловіч. Задача стаіць у тым, каб з новых пазіцый, на грунце нацыянальна-дзяржаўнай ідэалогіі паглядзець на айчынную гісторыю ад старажытнасці да сучаснасці. А ў сувязі з тым, што ў 2011 годзе будзе адзначацца 20-годдзе Рэспублікі Беларусь, кіраўніцтва навуковай установы разам з аддзяленнем гуманітарных навук і мастацтваў НАНБ ініцыявала правядзенне 29—30 чэрвеня наступнага года міжнароднай навуковай канферэнцыі «Рэспубліка Беларусь. 20 год незалежнасці».

• **Вітаўт загаварыў на расейскай.** Аўтар гістарычнага бестселера «Уладары Вялікага Княства» Вітаўт Чаропка цяпер піша для дзяцей. Першай стала кніга «Великий князь Витовт», прымеркаваная да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Дзяржаўныя выдавецтвы адмовіліся ад гэтай кнігі, бо дзяржава падтрымлівае выданне літаратуры на роднай мове. Кніга выйшла ў прыватным выдавецтве «ФАУінформ».

**МБ; СМ**

# Героі Беларусі

## Гісторык Уладзімір Ляхоўскі: Слуцкае паўстанне было арганізаваным супрацівам заможных гаспадароў.

**«НН»: 27 лістапада — Дзень герояў. Ён адзначаецца ў памяць пра Слуцкае паўстанне 1920 года. Слуцкі збройны чын — што гэта было? Крытыкі кажуць: звычайны сялянскі бунт. Чаму ён увайшоў у гісторыю Беларусі як такая значная падзея?**

**УЛ:** Гэта не бунт, не паўстанне люмпенаў. Гэта — арганізаваны супраціў заможных гаспадароў. Калі возьмем адрэзак часу пэрманентнай акупацыі тэрыторыі Беларусі, то ўбачым, што Слуцкі збройны чын быў не адзінай такой акцыяй, скіраванай супраць палітыкі бальшавікоў. Вяліжскае паўстанне 1918 года, паўстанне на Магілёўшчыне, на беларускай частцы Смаленшчыны, у Гарадку, Нясвіжы, Койданаве, Міры.

У адрозненне ад іх, Слуцкі чын быў выразна афарбаваны ў нацыянальныя, бел-чырвона-белыя колеры. Гэта арганізаванае выступленне не супраць чагосьці, а за беларускую дзяржаўнасць, за вызваленне этнічнай беларускай тэрыторыі ад акупацыйных войскаў, праўдзенне свабодных выбараў.

У дадатак да ўсяго нацыянальны чыннік злучаўся з сацыяльным. А такіх выпадкаў у гісторыі было не так шмат. Усебеларускі з'езд у 1917 годзе, калі людзі, якія дакладна яшчэ не ўяўлялі што такое Беларусь, злучыліся вакол ідэі існавання беларускай дзяржаўнасці і прадэманстравалі палітычную салідарнасць з ідэямі нацыянальнага руху. Гэта таксама Курапаты 30 лістапада 1988 года, калі на мітынг ішоў натоўп, а вяртаўся народ.

### Паміж Польшчай і Расіяй

**«НН»: А чаму менавіта Случчына паўстала?**

**УЛ:** Па-першае, вынік гэтага выступлення — шматгадовая чыннасць беларускіх нацыянальных арганізацый на Случчыне. «Папараць-Кветка» ў Слуцку, «Зорка» ў Грозаве, «Кутнёўская навуковая грамада»... Таксама трэба сказаць аб тым, што асновы Слуцкай брыгады беларускага войска склала былая гарадская і земская народная міліцыя, якая была ўтворана яшчэ вясной 1917 г.

Па-другое, склаліся спрыяльныя знешнія ўмовы. Паводле прэлімінарнага міру паміж Расіяй і Польшчай, гэтая тэрыторыя апынулася ў нейтральнай частцы. Слуцк яшчэ не быў заняты савецкімі войскамі, а польскія ўлады ўжо не кантралявалі сітуацыі ў горадзе. Беларускія дзеячы гэтым вырашылі скарыстацца.

Па-трэцяе, Случчына падчас Першай сусветнай вайны не так пацярпела, як іншыя рэгіёны. Тут было толькі 4,7% уцекачоў, у той час як на Гарадзеншчыне гэтая лічба дасягала 50—60%. І нягледзячы ні на нямецкую, ні на польскую акупацыі, сялянскія гаспадаркі развіваліся. Калі прыйшлі бальшавікі, адразу пачалася харчразвёрстка: забіралі збожжа, скаціну... Пачалася татальная мабілізацыя (палякі ў войска з беларусаў бралі толькі добраахвотнікаў). Многія ўжо прайшлі франты Першай сусветнай. І іх зноў пачалі забіраць у войска. Сяляне на сабе адчулі, што гэта за савецкая «народная ўлада».

### Першы бой

**«НН»: Пачаткам выступленняў стаў бой 27 лістапада.**

**УЛ:** Савецкія гісторыкі пісалі, што не адбылося ніводнага стрэлу. Але гэта быў падман. Разам з Аляксандрай Гесь і Уладзімірам Міхнюком мы склалі зборнік «Слуцкі збройны чын 1920 г. у дакументах і ўспамінах». На падставе савецкіх архіўных крыніц мы адлюстравалі гэты супраціў.

Сапраўды, першы бой з «чырвонымі» адбыўся 27 лістапада недалёка ад Семежава. У гэтым баі палегла некалькі беларускіх стральцоў, у тым ліку геройскай смерцю паў малады гімназіст Піліп Валодзька. У далейшым дзеянні случчакоў мелі ў асноўным партызанскі характар.

**Піліп Валодзька**

ураджэнец Старобіна. З'яўляючыся навучэнцам Слуцкай змяшанай гімназіі, ён узяў у рукі зброю і змагаўся поплеч з дарослымі мужчынамі. Валодзька стаў адной з першых ахвяраў у баях паміж паўстанцамі і чырвонаармейцамі. Пахавалі яго ў Семежаве. У 1930–х яму прысвячалі вершы Уладзіслаў Казлоўскі, Васіль Русак. Калісьці ягоным імем назавуць вуліцы і школы.

### Мільён у дэзерцірах, мільён ловіць дэзерціраў

**«НН»: Чаму бальшавікі не знішчылі паўстанцаў у першыя дні?**

**УЛ:** З Польшчай была падпісана дамова, па якой бальшавікі абавязаліся не ўваходзіць у нейтральную паласу. І случчакі карысталіся гэтым. Яны праводзілі акцыю і сыходзілі ў нейтральную зону. Праўда, у канцы снежня — пачатку студзеня бальшавікі паразумеліся з палякамі: Чырвонай Арміі дазволілі правесці зачыстку гэтай тэрыторыі.

Трэба адзначыць, што і армія бальшавікоў у той час была слаба арганізаванай. У войску былі хваляванні.

Хадзіў такі анекдот. Чырвоная Армія — гэта тры мільёны вайскоўцаў. Адзін мільён ваюе, другі — у дэзерцірах, трэці — ловіць дэзерціраў. Армія была няўстойлівай. Бальшавікі адразу нават асцерагаліся адкрытых баёў — баяліся, што чырвонаармейцы пачнуць перабягаць да паўстанцаў. І такія выпадкі былі. Дэзерціры пераходзілі на бок случчакоў і змагаліся супраць камуністаў, за што сяляне іх бясплатна кармілі.

**«НН»: А супрацьлеглыя выпадкі здараліся?**

**УЛ:** Вядомы толькі выпадак з адным з камандзіраў Слуцкага збройнага чыну, Паўлам Чайкам. Ён лічыў, што няма перспектыў змагацца і ўзброенае выступленне асуджана на паразу. Чайка вызваліў палоннага савецкага афіцэра, а той параіў здавацца ў абмен на захаванне жыцця. Як толькі ён здаўся, не прайшло і месяца, як Чайку расстралялі. Пераходзіў ён па ідэйных меркаваннях, а не таму, што быў здраднікам.



Пад паўстанцкім сцягам, 1921.


Цана асобн. нумеру. 3 . марк
БЕЛАРУСКАЕ СЛОВА
Палітычная, літэратурная і экономічная газэта.
№ 56. Горадня, Серада 8 студзеня 1920 г. Год выданьня I
ГРАМАДЗЯНЕ!
Несіце ахвяры рэчамі і грашмі! Складайце ахвяры у „Гуртці беларускіх кабет" ці у Беларускія Нацыянальныя Камітэты для перасылкі іх беларускаму паўстанцу—жаўнеру на Случчыне! Наша многапакутная Маці-Беларусь вымагае гэтага ад вас!

Абвестка ў гродзенскай беларускай газеце.



Беларуская карыкатура на Рыжскі мір 1921 года.

### Кіраўніцтва паўстанцаў не было маналітным

**«НН»: Кіраўніцтва паўстанцаў не было па сваіх пераканаціях маналітным. У чым былі галоўныя разыходжанні?**

**УЛ:** Частка не прыняла збройны супраціў савецкай уладзе. Іншыя хацелі, каб гэта была нейкая дэманстрацыя, што напалохае бальшавікоў, і тыя адмовяцца падпісваць Рыжскі мір. Але так не бывае. За свабоду трэба змагацца і праліваць кроў.

Тады яшчэ былі ілюзіі наконт таго, што бальшавікі перагледзяць свае пазіцыі і будуць лаяльнымі ў нацыянальным пытанні да беларускай рэспублікі.

Іншыя выступалі за супрацоўніцтва з палякамі, але былі ў меншасці і не мелі падтрымкі сярод сялян. Сяляне баяліся аднаўлення буйнога землеўладання польскіх абшарнікаў, якія арыентаваліся на далучэнне гэтай тэрыторыі да Польшчы. І, на жаль, не адбылося паразумення паміж рознымі групоўкамі.

**«НН»: Такі раскол сярод кіраўніцтва і прывёў да паразы?**

**УЛ:** Прычын шмат. Гэта быў сялянскі рух, які не злучаўся з заможным горадам, дзе мог атрымаць грошы і зброю. Не было міжнароднай падтрымкі. Гэтыя людзі былі нічыйнымі, як напісаў Андрэй Федарэнка (аповесць «Нічые»). Яны не атрымалі падтрымкі ні з боку Рады БНР, ні з боку кіраўніцтва беларускіх эсэраў у Мінску, ні з боку міжнароднай супольнасці.

**«НН»: Але палякам, відаць, было б на руку аддзяленне беларускай тэрыторыі ад Расіі?**

**УЛ:** У Пілсудскага была ідэя стварыць буфер, каб Польшча не межавала непасрэдна з бальшавікамі. Але большая частка польскай палітычнай эліты палічыла гэта нерэальным. Дмоўскі, лідар правых, прапаноўваў адмовіцца ад беларускай тэрыторыі, а мяжу правесці па той лініі, што пасля паўстала на перамовах у Рызе ў 1921 годзе. Адмовіцца зусім ад беларускіх зямель яны не маглі, бо атрымліваўся б глыбокі выступ на захад паміж усходняй Галіччынай, Валынню, якія ўжо адыходзілі да Польшчы, і Сярэдняй Літвой, якая таксама мусіла стаць польскай. І гэта ўяўлялася Польшчы стратэгічнай небяспекай. Гродзеншчына, Віленшчына і заходнія паветы Міншчыны павінны былі адысці да польскай дзяржавы. Далучэнне іншых беларускіх тэрыторый стварыла б значную праблему. Меркавалі ўзяць толькі тыя землі, якія разлічвалі асіміляваць за некалькі дзесяцігоддзяў.

### У беларускае войска ўступалі тысячы

**«НН»: Колькі чалавек налічвала войска паўстанцаў?**

**УЛ:** Калі быў кінуты кліч, што трэба ісці ў Семежава і ўступаць у беларускае войска, туды прыйшло ад сямі да дзесяці тысяч. Але не было зброі. І сфармавалі ўсяго два палкі. Калі б было адзінства ў кіраўніцтве, была зброя, то, як адзначаў Арсень Паўлюкевіч, былы старшыня Беларускага нацыянальнага камітэта Случчыны, магло быць і да пяцідзесяці тысяч чалавек.

**«НН»: Узброенае выступленне прынесла нейкія вынікі ці толькі наклікала рэпрэсіі на жыхароў краю?**

**УЛ:** Для бальшавікоў гэта было навукай. Яны адразу памянялі эканамічную палітыку: адмовіліся ад харчразвёрсткі і перайшлі на цвёрды харчовы падатак. А для сямей, чые бацькі ці браты ўдзельнічалі ў чыне, прымяняліся рэпрэсіі: іх выселілі з Беларусі. Гэта некалькі соцень сем'яў. А на іх месца засялялі сем'і з Паволжжа, дзе быў тады страшэнны голад.

**Гутарыў Сяргей Макарэвіч**

# Wikileaks: Расія ўказвае Беларусі, што купляць

Працяг са старонкі 2.

Адразу прыгадваецца кампліментарны візіт Берлусконі ў Мінск у 2009-м.

Хілары Клінтан запатрабавала ад амерыканскіх дыпламатаў збору інфармацыі пра сувязі Берлусконі з Пуціным і іх асабістыя бізнэс-повязі.

Сам Уладзімір Пуцін названы ў дакументах амерыканскага дзяржДэпартамента «альфа-самцом». На яго фоне прэзідэнт Дзмітрый Мядзведзеў выглядае «бледным і няўпэўненым» і наогул іграе ролю «Робіна пры Бэтмэне».

### Аліеў пра Мядзведзева

Кіраўнік аддзела Усходняй Еўропы французскага МЗС Ралян Галяраг у гутарцы з намеснікам дзяржсакратара ЗША Філіпам Горданам раскрытыкаваў механізм расійскай улады. Ахарактарызаваўшы Расію як «краіну з зачэпкамі дэмакратыі, але без якіх-небудзь механізмаў уплыву грамадства на працэс прыняцця рашэнняў урадам», дыпламат заўважыў: «Карані праблемы ляжаць у рэжыме».

Яго калега, прэзідэнцкі дарадца па замежнай палітыцы Дам'ен Лярас заўважыў, што «ў расійскіх лідараў адсутнічае дастатковае доўгатэрміновае бачанне іх краіны, замест гэтага яны сфакусаваныя на паўгадавым часавым гарызонце і сваіх бізнэс-інтарэсах».

Адна з цікавых для нашага рэгіёна дэпешаў — пасланне амбасады ЗША ў Азербайджане, якое расказвае аб сустрэчы намесніка дзяржсакратара Уільяма Бёрнза з прэзідэнтам Ільхамам Аліевым у лютым гэтага года. Там утрымліваюцца ацэнкі Аліевым ролі прэзідэнта Мядзведзева.

Аліеў лічыць расійскага прэзідэнта «сучасным інтэлектуалам новага пакалення», але атачаным людзьмі, якіх ён не кантралюе. З яговых словаў, ён асабіста быў сведкам таго, што рашэнні, прынятыя Мядзведзевым, патрабавалі далейшага зацвярджэння пуцінцамі, перш чым увайсці ў сілу.

Гэта датычыла пытання аб дэмаркацыі расійска-азербайджанскай мяжы, якую яны з Мядзведзевым узгаднілі, але ўсё «было пастаўлена ў тупік «іншымі», імаверна, з офіса прэм'ер-міністра». «Многія высокапастаўленыя чыноўнікі не прызнаюць (у Мядзведзеву) лідара», — цытуюцца словы Аліева, які бачыць «прыкметы сур'ёзных рознагалоссяў паміж камандамі двух палітыкаў, якіх няма на асабістым узроўні паміж Пуціным і Мядзведзевым».

«Як мы кажам у Азербайджане, «дзве галавы нельга варыць у адным катле», — сказаў Аліеў.

### «Абсыпалі дзяцей 100-даляравымі купюрамі»

Шыкоўная дэпеша апісвае маляўнічае вяселле сына дэпутата Дзярждумы Расіі Гаджы Махачава Далгата з яго аднакласніцай Аідай Шарыпавай. Гэта сапраўдная навела. З паведамлення дыпламата можна даведацца, што ў заканадаўца ёсць дамы ў Махачкале, Маскве, Парыжы і Сан-Дыега, сам ён ездзіць на Rolls Royce, а яго летняя рэзідэнцыя ў Каспійску ўяўляе сабой «40-метровую вежу на калонах, верхняя ярусы якой «дасяжныя толькі на ліфце», а нутро хавае «грот, пад падлогай якога вялізны басейн».

**Выцек дакументаў стаў нечаканым вынікам 11 верасня.**

Госцем Махачава быў чачэнскі прэзідэнт Рамзан Кадыраў, які прыехаў пад канец вечара. Рэспубліканскі кіраўнік «быў адзеты ў джынсы і майку, выглядаў ніжэйшым, не такім накачаным, як на фотаздымках, і быў крыху акаселы».

«Пасля феерверкаў музыкі зайгралі ў дзвары лезгінку, якую выканалі ў гімнастычнай версіі дзве дзяўчынкі і тры хлопчыкі, не старэйшыя за шэсць гадоў. Спачатку да іх далучыўся Гаджы, а затым і Рамзан, які нязграбна танцаваў з залатым пісталетам за поясам. Як адзначыў пазней адзін з гасцей, золата на зброі пазбаўляла яе практычнага прызначэння, але Рамзан усё роўна наўрад ці мог яе скарыстаць. І Гаджы, і Рамзан абсыпалі дзяцей 100-даляравымі купюрамі, так што пад нагамі танцораў апынулася не менш за $5 тыс. Гаджы пазней расказаў, што Рамзан падарыў шчаслівай пары «пяцікілаграмовы злітак золата».

### Дзяржаўную таямніцу выдаў шараговец

Белы дом афіцыйна ў нядзелю абвясціў, што «ў самых жорсткіх выразах асуджае недазволенае разгалошанне засакрэчаных дакументаў і інфармацыі, якая мае значэнне для нацыянальнай бяспекі».

Першай гучнай публікацыяй Wikileaks былі матэрыялы з Ірака і Афганістана.

Перадаў іх сайту ваенны аналітык Пентагона, шараговец 1-га класа Брэдлі Мэнінг.

У ліпені ён быў арыштаваны па падазрэнні ў аўтарстве іншых уцечак — у тым ліку відэароліка, на якім амерыканскія баявыя верталёты расстрэльваюць у Іраку здымачную групу Reuters. Мэнінг падставіўся сам: у размове з хакерам Эдрыянам Лейма ён заявіў, што хоча расказаць пра «паўкрымінальныя палітычныя змовы», якія раскрываюць, як «першы свет эксплуатуе трэці». Абнародаванне «дасье Дзярждэпа», на думку шарагоўца, мусіла прывесці да «дыскусіі ў планетарным маштабе, дэбатаў і рэформаў». Лейма здаў суразмоўцу «з патрыятычных меркаванняў».

Тым часам заснавальнік сайта Джуліян Асандж хаваецца ці то ў Швейцарыі, ці то ў Нарвегіі ад амерыканскіх уладаў і шведскага правасуддзя. У Швецыі яго расшукваюць па абвінавачванні ў згвалтаванні. Сам ён цвердзіць, што гэта падкоп ЦРУ.

Увогуле, з'яўленне дакументаў стала вынікам 11 верасня. Як так?

Рэч у тым, што тэракты 11 верасня 2001 года сталі магчымымі праз нескаардынаванасць розных амерыканскіх ведамстваў. Разведка папярэджвала пра магчымасць тэрактаў, аднак інфармацыя не дайшла да органаў бяспекі. ЗША зрабілі вывады. Цяпер інфармацыя дыпламатаў даступная Пентагону, разведкі — органам унутранай бяспекі і г.д. Аднак у выніку гэтага дакументы трапляюць на большую колькасць сталоў і камп'ютараў. І павялічваецца магчымасць выцеку інфармацыі.

### Сікорскі: Гэта ўдар па свабодным свеце

Вострую ацэнку публікацыі Wikileaks і кіраўніку партала Джуліяну Асанджу даў міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі:

— На маю думку, гэта прывядзе да таго, што ўсе будуць больш асцярожныя. Цяпер публічна нельга сказаць нічога цікавага ці, не дай божа, якога моцнага слоўца, бо гэта потым паўтораць у скажоным выглядзе; і чаго тады дзівіцца, што запанавала правільнасць, паўтаральнасць і нуда. Здаецца, тое самае чакае дыпламатыю. Такім чынам, «Містар Wikileaks» Джуліян Асандж, дэкларуючы спрыянне свабодзе выказванняў, насамрэч яе абмяжоўвае, — сказаў Сікорскі.

— Гэта Оруэл у квадраце. Праз некаторы час ужо цяжка будзе весці любыя размовы з саюзнікамі. Супрацоўнікі Wikileaks пра таямніцы Паўночнай Карэі і Ірана даведацца не змаглі, а калі б і даведаліся, б'юся аб заклад, што не апублікавалі б, таму што мы ведаем, што з імі сталася б. Гэта ўдар па свабодным свеце і свеце адкрытага грамадства, дзе свабода слова лічыцца найвышэйшай каштоўнасцю, — зазначыў Сікорскі.

**Статыстыка базы дадзеных Wikileaks**

У архіве 251 288 дакументаў,

15 652 з іх — з грыфам «сакрэтна».

Самы стары дакумент датаваны 1966 годам, самы свежы — лютым 2010 года.

Дэпешы зыходзяць з 274 пасольстваў і прадстаўніцтваў ЗША па ўсім свеце.

**Тэматыка дакументаў**

міжнародныя адносіны — 145 451

унутраная палітыка — 122 896

правы чалавека — 55 211

эканоміка — 49 044

тэрарызм і тэрарысты — 28 801

Рада Бяспекі ААН — 6532

«Не сакрэт, што такія падзеі не павялічаць прэстыжу Злучаных Штатаў, а радаваць нас гэта не можа, бо Злучаныя Штаты не толькі наш найважнейшы саюзнік, але і апора вольнага свету», — сказаў ён.

«Тое, што хаваецца ў сакрэце, — не заўсёды праўда, — адзначыў міністр. — Гэтыя дэпешы адлюстроўваюць чалавечыя меркаванні і чалавечыя памылкі. Матэрыялы вымагаюць інтэрпрэтацыі. Гэта як салата: з яе можна выцягнуць смачныя кавалкі, але паасобку яны не дадуць разумення амерыканскай палітыкі», — дадаў ён.

**Мікола Бугай, Алесь Пілецкі**

# ЗША можа выйсці ў лідары па экспарце газу

**Дзякуючы сланцаваму газу, цана газу ў ЗША ўдвая меншая, чым у Еўропе.**

Дзякуючы выкарыстанню сланцавага газу ЗША займелі такі лішак таннай сыравіны, што рыхтуюцца да экспартнай экспансіі.

Кіраўнік амерыканскага газапорта Freeport LNG разам з аўстралійскім фондам Macquarie мае намер да 2015 года выдаткаваць $2 млрд на экспарт газу з Freeport'а, у першую чаргу ў Азію. Тэрмінал Freeport LNG быў пабудаваны некалькі гадоў таму, калі амерыканскія эканамісты прадказвалі, што ўласныя запасы газу будуць вычарпаныя, і Злучаным Штатам давядзецца імпартаваць яго ўсё больш.

Гэтыя прадказанні былі абвергнутыя каля чатырох гадоў таму, калі былі распрацаваныя наватарскія метады здабывання газу са сланцавых скалаў.

Дзякуючы гэтаму вытворчасць газу ў ЗША хутка расце, і ўжо ў мінулым годзе ЗША ўпершыню за апошнія дзесяць гадоў забралі ў расійцаў званне найбуйнейшага вытворцы газу ў свеце.

— У нас ёсць уласныя рэсурсы газу, дастатковыя для задавальнення патрэбаў ЗША на наступныя сто гадоў, — падкрэсліў кіраўнік Freeport LNG Майкл Сміт, якога цытуе Reuters. У Злучаных Штатах выбляецца ўсё больш і больш сланцавага газу, і кошты на сыравіну ў гэтым годзе ў ЗША ўпалі ўжо на чвэрць.

За 1 тыс. кубічных метраў газу ў ЗША цяпер плацяць каля 140 даляраў. Гэта ў паўтара разу менш, чым Беларусь плаціць «Газпраму». А Беларусь жа мае найніжэйшыя цэны ў Еўропе...

І ў той жа час усё больш і больш кампаній хочуць выкарыстаць сланцавы бум.

Экспарт — найлепшы спосаб рэгуляваць лішкі таннага газу са сланцаў і выкарыстоўваць амерыканскія газапорты, якія прастойваюць за непатрэбнасцю — з гэтым пагаджаецца ўсё больш экспертаў па той бок Атлантыкі. У ЗША, прынамсі ў сярэднетэрміновай перспектыве, будзе лішак газу, які можа быць экспартаваны, — паведаміў Робін Бэйкер, кіраўнік энергетычнага аддзела французскага банка Société Générale.

Вялізныя запасы сланцавага газу адкрытыя таксама ў Польшчы. Выяўленыя істотныя запасы яго таксама ў Нямеччыне, Украіне. Калі радовішчы ўдасца распрацаваць, Еўропа зможа радыкальна збіць цэны на расійскі газ.

Геолагі мяркуюць, што гарызонты, багатыя на сланцавы газ, могуць цягнуцца і ў Беларусь.

У Польшчы яны цягнуцца ад Балтыкі двума рукавамі аж да беларускай мяжы.

**КаМ; МБ**




Шэрым — залежы сланцавага газу ў Польшчы.

## СПОРТ

**«Дынама» — «Амур» (Хабараўск)**

**2 снежня (чацвер) а 19-й на «Мінск-Арэне»** — хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Амур» (Хабараўск).

**«Дынама» — «Металург» (Новакузнецк)**

**4 снежня (субота) а 17-й на Мінск-Арэне** — хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Металург» (Новакузнецк). Пачатак у 17.00.

## КАНЦЭРТЫ

**«J:морс»**

**11 снежня а 19-й у Палацы спорта** — канцэрт «J:морс» «Электрычнасць».

**Myslovitz**

**3 снежня ў «Рэактары» (Харужай, 29) а 19-й** — канцэрт польскага гурта Myslovitz.

**Neuro Dubel**

**2 снежня ў JackClub (Няміга, 12)** зайграе Neuro Dubel. **Пачатак а 21-й.**

## ІМПРЭЗЫ

**«Сумоўе»**

**Паэтычны тэатр «Арт.С» (бібліятэка імя Цёткі, Талбухіна, 12а) 3 снежня а 18-й** запрашае на «Сумоўе» Вадзіма Клімовіча і Яраша Малішэўскага.

## ВЫСТАВЫ

**Вернутыя імгненні. Яўрэі царскай Расіі**

**Да 16 снежня ў Гістарычным музеі** працуе выстава «Вернутыя імгненні. Яўрэі царскай Расіі». На выставе можна ўбачыць фоты з калекцыі Расійскага этнаграфічнага музея, а таксама рарытэтныя рэчы сакральнага і побытавага прызначэння традыцыйнай яўрэйскай культуры з калекцый Гістарычнага музея Беларусі.

**Казкі новай зімы**

**Літаратурны музей Максіма Багдановіча (Багдановіча, 7а)** запрашае **з 10 па 12 снежня з 15-й да 19-й** на святочныя майстар-класы «Казкі новай зімы». На майстар-класах будуць прадстаўлены як традыцыйныя віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, так і сучасная гарадская хэнд-мэйд культура. Кожны зможа выбраць сабе занятак даспадобы… Праграма: **10 снежня.** Дзень першы. Казкі ад бабулі. **15.00** — урачыстае адкрыццё; **15.10 — 19.00** — майстар-класы па традыцыйных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. **11 снежня.** Дзень другі. Сяброўчына казка. **15.00 — 19.00** — майстар-класы па сучасным hand-made мастацтве. **12 снежня.** Дзень трэці. Твая казка. **15.00 — 19.00** — майстар-класы. Кірмаш; **19.30 — 21.00** — рок-катрынка. Выступы моладзевых рок-гуртоў.

**Барыс Забораў**

**Да 10 снежня ў Мастацкім музеі (Леніна, 20)** выстаўленыя 38 твораў жывапісу і скульптуры Барыса Заборава. Мастак нарадзіўся ў Мінску ў 1935-м, ад 1981 ён жыве ў Парыжы. Яго называюць беларускім мастаком, а сам Забораў лічыць сябе грамадзянінам сусвету, радзіма якога — Беларусь.

**Няскончаная п’еса для механічнага шыла**

**Да 9 студзеня ў Гістарычным музеі (Маркса, 12)** працуе выстава швейных машынак «Няскончаная п’еса для механічнага шыла». Вы зможаце даведацца пра асноўных вытворцаў швейных машын XIX—XX стст., убачыць спадарожныя атрыбуты краўцоў (манекены, нажніцы, прасы, тэкстыль мінулых гадоў і інш.), ілюстрацыйны матэрыял па гісторыі моды і рэкламу.

**Юдаль Пэн у Мінску**

**У Музеі Якуба Коласа (Акадэмічная, 5) да 21 снежня** працуе выстава партрэтаў і краявідаў Юдаля Пэна. У экспазіцыі — 23 працы майстра з калекцыі Віцебскага краязнаўчага музея. Акрамя таго, дэманструюцца 40 паштовак з краявідамі Віцебска пачатку XX стагоддзя.

## ТЭАТРЫ

**1 снежня**

**Беларускай драматургіі** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**Купалаўскі** — «Старамодная камедыя»

**2 снежня**

**Юнага гледача** — «Трошкі пяшчотны»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»
**Купалаўскі** — «Паўлінка»
**Оперы і балета** — «Рэквіем»

**3 снежня**

**Юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

**4 снежня**

**Юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Оперы і балета** — «Бахчысарайскі фантан»

**5 снежня**

**Юнага гледача** — «Брык і Шуся шукаюць лета»
**Лялек** — «Марозка»
**Беларускай драматургіі** — «Сонечка»

**6 снежня**

**Зніч** — «Дзівосныя авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага»
**Купалаўскі** — «Я не пакіну цябе»

**7 снежня**

**Беларускай драматургіі** — «Адамавы жарты»
**Оперы і балета** — «Набука»

**8 снежня**

**Зніч** — «Пачакай, сонца!»
**Беларускай драматургіі** — «Жан і Беатрыса»
**Оперы і балета** — «Кармен»
**Купалаўскі** (Малая сцэна) — «Востраў Сахалін»
**Купалаўскі** — «Памінальная малітва»

**9 снежня**

**Зніч** — «У краіне светлай…»
**Лялек** — «Марынка-крапіўніца»
**Беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Оперы і балета** — «Тоска»

**10 снежня**

**Беларускай драматургіі** — «Неба ў дыяментах»
**Лялек** — «Драй швестэрн» (для дарослых)
**Оперы і балета** — «Травіята»

**11 снежня**

**Лялек** — «Кот у ботах»
**Оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Беларускай драматургіі** — «Нязваны госць»

**12 снежня**

**Лялек** — «Васіліса Прыўкрасная»
**Беларускай драматургіі** — «Чайка»
**Оперы і балета** — гала-канцэрт зорак сусветнай оперы



# БАТЭ—Дынама (Кіеў)

**2 снежня (чацвер) у 22.05 на мінскім стадыёне «Дынама»** — матч 5-га тура групавога раўнда Лігі Еўропы. Гуляюць БАТЭ і «Дынама» (Кіеў). Фактычна, гэта будзе гульня за 1-е месца ў групе.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## КІНО

# Гэтага фільма спалохаўся Стывен Кінг




**Упусці мяне** (Let Me In)

ЗША — Вялікабрытанія, 2010, каляровы, 116 хв.

**Рэжысёр:** Мэт Рыўз

**Ролі выконваюць:** Кодзі Сміт-Мэрфі, Хлоя Морэц, Рычард Джэнкінс, Кара Буона, Эліас Катэас

**Жанр:** Вампірская драма

**Адзнака:** 6 (з 10)

Дванаццацігадоваму Оўэну, якога б’юць аднакласнікі, падабаецца суседская дзяўчынка. Эбі таксама даспадобы Оўэн. Толькі ціхая суседка — вампірка і харчуецца чалавечай крывёй…

Карціна Мэта Рыўза — паўторная экранізацыя меланхалічнага рамана Джона Айвіда Лінквіста. Першая пастаноўка, зробленая ўсяго два гады таму шведам Томасам Альфрэдсанам, сабрала заслужаныя ўзнагароды на міжнародных фэстах.

Расейскія пракатчыкі дадалі падзагаловак «Сага».

Фільм Мэта Рыўза не такі вытанчаны, як паэтычная прыпавесць Томаса Альфрэдсана. Затое ў стужцы болей крыві і кашмараў, дзіцячы твар часцей змяняецца дэманічным выскалам у стылі «Экзарцыста».

Кароль жахаў Стывен Кінг рэкламуе карціну як адзін з самых страшных фільмаў апошніх гадоў.

**Андрэй Расінскі**

# Азербайджанская опера на беларускай сцэне

У Музычным тэатры адбылася прэм’ера камічнай оперы азербайджанскага класіка Узэіра Гаджыбейлі (па-расійску Гаджыбекава) «Аршын мал алан»

у пастаноўцы азербайджанца Хафіза Гуліева.

Я сумнявалася, што гэтая падзея выкліча ў публікі цікавасць, але ўжо на генеральным прагоне зала была набітая. Прычым гэта былі не музыкі, не акторы, а звычайныя гледачы. Тыя, хто памятае стары савецкі фільм, дзе гучыць салодкі тэнар Рашыда Бейбутава. Былі сярод публікі і беларускія мусульмане, якіх у краіне дзясяткі тысяч.

Кампазітар пісаў сваю оперу ў 1912 годзе, калі па пратэкцыі і на грошы свайго сябра Мусліма Магамаева (дзеда спевака) вучыўся ў Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі. Да гэтага часу ён ужо прайшоў грунтоўную школу традыцыйнага мугамнага спеву і спрабаваў злучыць нацыянальную традыцыю з вынаходствамі еўрапейскага аркестравага ліста. Выйшла вельмі прыгожая, пераборліва арнаментаваная музыка, нязвыклая для еўрапейскага вуха.

На здзіўленне, аркестр выдатна даў рады вышуканым каўказскім мелодыям. Крыху бракавала «вострых прыправаў» — азербайджанскіх ударных інструментаў кшталту нагары, якіх у Мінску проста няма. Сола на тары і сазе (азербайджанскія шчыпковыя інструменты, у чымсьці роднасныя індыйскім сітарам) гучалі ў запісе, але атрымалася вельмі прыгожа.

Галоўную ролю на прэм’еры даверылі азербайджанскаму тэнару Фарыду Аліеву, які, на мой густ, гучыць не горш за Бейбутава. Усе астатнія ролі выконвалі беларускія артысты.

Лесі Лют удалося ідэальна перадаць азербайджанскі класічны стыль і ў музыцы, і ў спевах, і ў танцы. Вельмі добрая была Наталля Гайда ў ролі сапраўднай азербайджанскай цётачкі. Спадабаліся і Аляксандр Асіпец, і Антон Заянчкоўскі, і Ігар Бычкоў, і маладая таленавітая Вікторыя Жбанкова-Стрыганкова. Немагчыма паверыць, што тэатр літаральна за 20 дзён вывучыў гэты найскладанейшы матэрыял і прынёс публіцы велізарную радасць.

Дарэчы, з Азербайджанам звязаная яшчэ адна прыемная для нас падзея. 1 лістапада ў Маскве ў Крокус Сіці-холе завяршыўся Першы міжнародны конкурс вакалістаў імя славутага азербайджанскага спевака Мусліма Магамаева. Першую прэмію на ім атрымаў беларускі барытон Ілля Сільчукоў, а трэцюю — наша меца-сапрана Аксана Волкава. У журы былі Тамара Сіняўская, Алена Абразцова, Юрый Башмет, Мішэль Легран...

**Юлія Андрэева**

# Галоўпаштамт застаўся ў 1953 годзе

У Мінску, на Галоўпаштамце, працуе традыцыйны кірмаш святочных паштовак.

На ім можна набыць найлепшыя айчынныя ўзоры.

Праўда, летась свае паштоўкі супрацоўнікі галоўнага паштовага аддзялення краіны называлі «паштоўкамі». Аднак сёлета кіраўніцтва ўстановы вырашыла, што слова «паштоўка» не зусім адпавядае зместу выставы, і выкарыстала слова «адкрыткі».

На пытанне карэспандэнта «Нашай Нівы», дзе супрацоўнікі Галоўпаштамта знайшлі такое слова, арганізатарка кірмаша заявіла, што «гэтае слова адпавядае правілам беларускай мовы» і што «мы заўсёды карыстаемся добрымі слоўнікамі». У найноўшы «Арфаграфічны слоўнік», падараваны рэдакцыі «НН» асабіста Аляксандрам Лукашанцам і спецыяльна прынесены карэспандэнтам на Галоўпаштамт, жанчына глядзець не захацела. Яна загадала падначаленай прынесці ўласны слоўнік. Яго прынеслі і з гонарам выдалі ў рукі карэспандэнту. Галоўным слоўнікам Галоўпаштамта аказаўся «Руска-беларускі слоўнік» 1993 года, перадрукаваны з «Руска-беларускага слоўніка» 1953 г. Слова «адкрытка» там насамрэч апынулася. Але яно стаяла пасля слова «паштоўка»...




АЛЕСЬ ПІЛЕЦКІ

Кірмаш святочных паштовак на Галоўпаштамце будзе працаваць да праваслаўнага Раства.

**Алесь Пілецкі**

# Карэспандэнт «НН» сеў п’яны за руль. Эксперымент

ДАІ пачала выкарыстоўваць «п’яныя акуляры».

Штодзень на дарогах адной толькі Мінскай вобласці затрымліваюць 50 кіроўцаў «пад градусам». Каб навучэнцы аўташколаў разумелі, як адчувае сябе нецвярозы чалавек за рулём, ДАІ вырашыла пераняць нямецкае ноу-хау — «п’яныя акуляры».

Такая прылада прымяняецца ў нямецкіх аўташколах. Там яе і пабачыла кіраўніцтва беларускай ДАІ ў часе адной з паездак у Германію для абмену досведам.

Выглядаюць акуляры, як звычайныя лыжныя. Іх лінзы зробленыя так, што, пераломваючы святло, выклікаюць у чалавека, які праз іх глядзіць, эфект, падобны да ап’янення. Мозг «вядзецца» на гэты падман.

Карэспандэнт «НН» выпрабаваў «п’яныя акуляры» на сабе.

«Ніхто з тых, хто спрабаваў праехаць у акулярах звычайную «змейку», — не змог! — кажа кіраўнік аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ Мінаблвыканкама Алег Цюрын. — Яны даюць ілюзію таго, што ў вашым арганізме два праміле алкаголю — прыблізна бутэлька гарэлкі. Інспектары і на веласіпедзе спрабавалі — немагчыма. Дый пешшу не ўсім удаецца».

Першы раз мы спрабуем начапіць акуляры ў памяшканні. Пакой размываецца, падлога сыходзіць кудысьці ўніз, а інспектар падвойваецца. З’яўляецца адчуванне, што разам са «стратай цвярозасці» губляецца яшчэ і зрок. Устаць з крэсла яшчэ можна, а вось рухацца далей — праблематычна. Праз крок натыкаюся на стол.

«Тут ёсць хітрасць: трэба заплюшчыць адно вока, — падказваюць мне дасведчаныя даішнікі. — П’яныя звычайна так і едуць».

Спрабую. Людзей у пакоі робіцца ўдвая менш — і тое добра, але няправільны фокус захоўваецца.




Цяпер ДАІ дабіваецца, каб «п’яныя акуляры» былі ва ўсіх аўташколах. Каштуюць яны нядорага: 60—80 еўра.

Наступная частка эксперыменту — выхад у горад. Добра, што эксперыментавалі мы на ціхім Першым Загарадным завулку, па якім машыны ездзяць з рэгулярнасцю раз на дзве хвіліны.

Але адчуваць сябе спакойна ў машыне з абсалютна п’яным, хоць і віртуальна, кіроўцам, немагчыма. Наш кіроўца насунуў акуляры і прамовіў: «Едзем роўна». Машына адхілілася ў левы бок і ўсё імкнулася пратараніць што-небудзь з аўтатранспарту, прыпаркаванага на процілеглым баку. Пад маім пільным кіраўніцтвам мы змаглі трохі выраўняцца. Ледзь машына праехала паўметра, нас рэзка панесла ўправа. Па словах кіроўцы, ён ехаў проста...

Метад «заплюшчы вока» не дапамагаў: агульная бачнасць ад гэтага лепшай не стала.

Прыпаркаваўшыся, вырашылі на чарзе праверыць, як адчувае сябе аматар гарэлкі, які выходзіць з аўто. Сяк-так дацягнуўшыся да асфальтаванай часткі тратуара, я паспрабаваў ісці проста. Няўдала. Збоку мая хада нагадвала матэматычны знак «бясконцасць».

Не ведаю, як на маладых кіроўцаў, але на нас уражанняў ад «п’янага кіравання» хопіць да канца жыцця. Хочацца верыць, што такія акуляры з’явяцца на экзаменах ва ўсіх аўташколах краіны.

**Юрась Ускоў**

# Самыя небяспечныя — чорныя аўто

Гэта найменш заўважны на дарозе колер.

На працягу 20 гадоў навукоўцы з аўстралійскага Універсітэта Монаша высвятлялі, якога колеру аўтамабілі найчасцей трапляюць у ДТЗ. Вывучыўшы 850000 аварый, прыйшлі да высновы, што — чорныя. Днём такія машыны траплялі ў аварыі на 12% часцей астатніх, а ўначы — на 47%.

Другое і трэцяе месца па аварыйнасці занялі аўтамабілі шэрага і серабрыстага колераў. На чацвёртым і пятым месцы ідуць чырвоныя і сінія машыны. Самым бяспечным колерам прызнаны аранжавы.

**СМ**

ТЭХНАЛОГІІ

# Некіраваны мабільнік

Тэлефон гамельчука сам адправіў SMS на 9 млн рублёў.

Абанент кампаніі «Вэлком» **Сяргей Сівянкоў (на фота)** стаў ахвярай «SMS-уцечкі». Ноччу яго мабільны тэлефон з інтэрвалам у 2—5 секунд пачаў дасылаць паведамленні на платны нумар 5555. За тры гадзіны было даслана 938 SMS, у выніку чаго Сівянкоў сышоў «у мінус» на 9 млн рублёў.

Па словах Сівянкова, з яго 3G-мадэма кампаніі «Вэлком» самі сабой пачалі дасылацца SMS-паведамленні. Хлопец пераставіў SIM-карту з мадэма ў мабільны тэлефон. Аднак гісторыя паўтарылася. Адна за другой на экране з’ўляліся справаздачы аб дастаўцы паведамленняў. Сяргей патэлефанаваў прадстаўніку кампаніі з просьбай заблакаваць нумар, але паразумення не знайшоў.

На лагічнае пытанне, чаму ён не дастаў з тэлефона SIM-картку, малады чалавек цяпер адказвае: запанікаваў, тэлефанаваў аператару, лаяўся, праз кожную хвіліну правяраў баланс...

Раніцай, атрымаўшы ў офісе кампаніі дэталізацыю рахунку, малады чалавек выявіў, што 938 SMS былі адпраўленыя на нумар 5555, які адносіцца да платнага сэрвісу «WEB SMS ультра».

З дапамогай гэтага сэрвісу абаненты «Вэлком» могуць замовіць сабе на тэлефон карцінкі, мелодыі. Кожнае паведамленне, адпраўленае на гэты нумар, каштуе 9900 рублёў. На дзявятай старонцы раздрукоўкі Сяргей убачыў вердыкт: агулам да аплаты — 9 286 200 рублёў.

Спецыялісты кампаніі, цалкам выключыўшы магчымасць адпраўкі паведамленняў па іх віне, прапанавалі некалькі версій.



Магчыма, абанент сам адправіў гэтыя SMS, а цяпер спрабуе неяк выкруціцца. Таксама можа быць, што ён усталяваў праграму, якая адпраўляе SMS-паведамленні аўтаматычна, або яго тэлефон быў заражаны вірусам.

Яшчэ ёсць магчымасць таго, што абанент перапрашыў сваю SIM-картку — гэта ж звычайны чып, які можна перапраграмаваць.

У выпадку Сяргея можна выключыць адпраўку паведамленняў ім асабіста. На відэа, якое малады чалавек зняў на свой фотаапарат, відаць, што ніхто не дакрануўся да тэлефона падчас бесперапыннай адпраўкі паведамленняў. Ды і сумнеўна, што чалавек здольны адпраўляць 15 паведамленняў за хвіліну на працягу трох гадзін.

Варыянт з вірусам або праграмай для аўтаматычнай адпраўкі паведамленняў таксама можна выключыць — мадэль тэлефона Nokia 1202 занадта простая і не падтрымлівае такія праграмы. Застаецца толькі варыянт з перапраграмаваннем SIM-карты.

Пацярпелы Сяргей Сівянкоў упэўнены, што ў яго праблеме вінаватая кампанія «Вэлком». Ён спадзяецца, што знойдзе падтрымку ў судзе.

**«Салідарнасць»**

Сапраўдная беларуская кухня

## Сезон гусей

### Гусь у грыбной падліўцы

1 гусь, 7—8 вялікіх сушаных белых грыбоў, 1 морква, корань пятрушкі, корань сельдэрэю, 2 ст. лыжкі мукі, 2 ст. лыжкі тлушчу, 3—4 шклянкі булёну, смятана, соль, спецыі да густу.

Тушку гусі рассячы на кавалкі, зварыць разам з сушанымі грыбамі, морквай, пятрушкай і сельдэрэем, нарэзаць кубікамі. Перад заканчэннем варкі пасаліць.

Падсмажыць на тлушчы муку, развесці падсмажанай мукой булён і праварыць на слабым агні пры памешванні. Перад тым, як зняць з агню, дадаць смятану. Гатовае мяса пакласці на талерку, гарніраваць адварным карэннем, грыбамі і заліць атрыманым соусам.

**НБ**

## Прыватныя абвесткі

### ВІТАННІ

**Дарагі тата Васіль Нікіфаравіч Аксючыц!** Віншуем цябе з 75-годдзем. Няхай твае залатыя гады будуць радасцю. Няхай унукі пераймаюць ад цябе тваю працавітасць, весялосць, зычлівасць. Сыны і дачка.

**Любімага барда Андрэя Мельнікава віншуем з днём нараджэння!** Андрэй, Вашы песні «Казка», «Выйдзі», «Аршанская бітва», «Гэта мы» — супер! Ваша «Гэта мы» — нацыянальны брэнд!

### ДАПАМОГА

**Патрабуецца** дапамога ў даглядзе інваліда (жанчыны) у Гродне. Т.: (029) 582-51-34.

### ПРАЦА

**Шукаю працу бармена ці афіцыянта** ў Гродна ці Мінску. Вялікі вопыт. Т.: 8-015-63-31-3-47. Станіслаў

### КНІГІ

**Мікола Ермаловіч «Выбранае», Васіль Зуёнак «Выбраныя творы»** — чарговыя кнігі праекта «Беларускі Кнігазбор» — ужо ў продажы.

**Выйшла кніга «страдацельных» песень «Жорсткі раманс»** (недаследаваны жанр у беларускай фалькларыстыцы). 435 старонак. Ахвотным набыць: (029) 672-03-75.

**Набуду «Беларускі Кнігазбор»:** Чачот, Багдановіч, Жылка, Брыль, Геніюш, Гётэ. Т.: (025) 632-61-99. Павел.

**Шукаю дыскі з песнямі** «Янка Купала», «Даставай, Язэп, гармонік», а таксама кнігі М.Ткачова, 1-ую частку «Замкі Беларусі». Т.: (029) 667-39-06. Андрусь.

### ВОПРАТКА

**Дапамагу ў стварэнні** паўсядзённай і святочнай вопраткі. Наталля. Т.: (029) 353-73-06.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі

1) Прозвішчы Пеці і Васі Сіліч і Новік. Хто мае якое прозвішча, калі Пеця на 3 гады маладзейшы за Сіліча?

2) У 5 каробках ляжаць гузікі. Калі з кожнай каробкі ўзяць па 30 гузікаў, то ва ўсіх каробках застанецца столькі гузікаў, колькі раней было ў двух каробках. Колькі гузікаў было ў кожнай каробцы першапачаткова?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**






**На вучэбным выбарчым участку ў Талачыне скрыні апячатаныя пластылінам.**

## ЗЛОБА ДНЯ

ПРЭЗІДЭНЦКІ КАЛАЎРОТ

У панядзелак ён народнік.
У аўторак — празаходнік.
Ад аўторка да сярэды —
брат усходняга суседа.
Бае ў сераду народу
пра багацце і свабоду
(а пад вечар, усім наўздзіў,
зноў усё забараніў).
У кітайцаў у чацвер
бярэ грошы напавер.
Ад чацверка да пятніцы
прэ з Амерыкай мірыцца.
У пятніцу ён герой:
расплюваўся із Масквой.
Ад суботы да нядзелі
з Угам у Венесуэле…

А пасля — усё спачатку,
толькі ў іншым мо парадку.
І вось так шаснаццаць год
круціць гэты калаўрот.

**Сяргей Мікулевіч**

**Пра перадвыбарную праграму кандыдата А.Лукашэнкі чытайце на старонцы 8.**

## Анекдоты

* * *

У войску перад выбарамі:

— Таварышы салдаты, калі вы за Лукашэнку, пастаўце ў бюлетэні ля прозвішча птушачку. Калі супраць, то крыжык.

* * *

Юрфак, экзамен па філасофіі:

— Прывядзіце прыклад адзінства і барацьбы процілегласцяў.

— Пракурор-хабарнік.

* * *

— У вас у кухні на сценах прусакі!

— Гэта шпалеры такія.

— Навошта?

— Каб госці не заседжваліся.

* * *

Да прыкаванага на скале Праметэя штодня прылятаў арол і разбураў яго пячонку гарэлкай.

* * *

— Ты жанаты?

— Часова.

— Гэта як?

— Старэйшы брат на курорце, і яго жонка пакуль замест яго лае мяне...

* * *

Калі муж стаў значна радзей прасіць есці, я зразумела, што ён займеў палюбоўніцу...

## «НН» сто гадоў з вамі

**У Пінску суд разглядаў справу 12 арыштантаў, каторыя ўцяклі з турмы.** На судзе адкрылася такое страшнае палажэнне арыштантаў у астрозе, што прысяжныя суддзі ў адзін голас апраўдалі ўцекачоў.

**«НН». № 43. 1910.**

**Усіх сяброў зрабіць членамі**

Управа юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама не зарэгістравала Смаргонскае грамадскае аб'яднанне «Праваабарончы цэнтр» і запатрабавала, каб слова «сябар» у статуце замянілі словам «член». Чыноўнікі — «гаварыць як хацяць», а ўсё памыкаюцца кіраваць мовай ды вызначаць, якое слова адпавядае літаратурнай норме, а якое не. Мабыць, і ансамблю «Сябры» з ягонаю назвай цяпер ніякая перарэгістрацыя не свеціць.

**«НН». №48. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) Вася Сіліч і Пеця Новік; 2) У кожнай каробцы ляжыць 50 гузікаў.



**Калядны час — сусветны бум спажывання. На фота — святочная ялінка ў парыжскім універмагу Galeries Lafayette.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**У Віцебску прайшоў Міжнародны фестываль харэаграфіі. Шагалаўскія ноткі ў выступе віцебскага Тэатра сучаснай харэаграфіі Д.Юрчанкі.**



**У пакістанскім Мангапіры мясцовая суфіцкая грамада гадуе свяшчэнных кракадзілаў. Месца наглядчыка за імі пераходзіць з пакалення ў пакаленне.**

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914),
Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч,
У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32,**
**8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6436.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 30.11.2010.
Замова № 5846.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 1819-1614